Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛІПЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №138 (28502)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




## Стэндап: жарты аб асабістым

СТАР. 5




## Турыст падманваецца рады?

СТАР. 13



## Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**35 законапраектаў**

*і дэкрэт Прэзідэнта папярэдне прапануецца ўключыць у графік для разгляду на восеньскай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Прадстаўляючы праект графіка падрыхтоўкі пытанняў для трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў шостага склікання, віцэ-спікер Баляслаў Пірштук вылучыў блок законапраектаў у сферы эканомікі — аб неплацежаздольнасці і банкруцтве, аб карэкціроўцы законаў «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)», «Аб крэдытных гісторыях», «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі» — і падкрэсліў важнасць законапраектаў па пытаннях абароны, барацьбы з тэрарызмам, абароны дзяржаўных сакрэтаў, удасканалення грамадзянскага, крымінальнага і працэсуальнага заканадаўства.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9465 | ▼ |
| Еўра | 2,2393 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0751 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# Школьны аўтограф




Традыцыя ўвекавечваць выпускныя класы фарбай на вуліцы ў вёсцы Даўгінава Вілейскага раёна пачалася з часоў, калі ў населеным пункце паклалі асфальт. Але сёлета на дарозе з'явіўся нечаканы аўтограф — акрамя традыцыйнага «Выпуск—2017» на асфальце напісаны імёны ўсіх дваццаці чатырох даўгінаўскіх выпускнікоў. Мне давялося сустрэць трох выпускніц з гэтага спіса — Ганну КАВІНЬКА, Ксенію БАРАВІК і Ксенію АСАДНІК. Яны прыйшлі зрабіць фота на фоне аўтографа.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

■ Жыллёвае пытанне

## МІСІЯ ВЫКАНАЛЬНАЯ

### Знайсці кватэру ў сталіцы за дзень

**Не за гарамі верасень з традыцыйным «студэнцкім бумам», а гэта азначае, што рынак арэнднага жылля чакае рух. Тыя маладыя людзі, каму не пашчасціла атрымаць інтэрнат на наступны навучальны год, ужо зараз шукаюць жыллё. У ход ідуць усе сродкі — пошук арэнднай плошчы на інтэрнэт-пляцоўках, зварот да агенцтваў, нервовае перагортванне газет з аб'явамі. Карэспандэнт «Звязды» вырашыў паспрабаваць знайсці кватэру ў Мінску за суткі.**

### ШТО ПА ЧЫМ?

Магчыма, мы яшчэ не хутка створым у краіне постындустрыяльнае грамадства, але за сем гадоў, скажу я вам, пошук кватэры значна спрацуйся. Роўна столькі гадоў таму я ўпершыню прыехаў у сталіцу як першакурснік, і перада мной стаяла задача знайсці жыллё. Тады я выдаткаваў не адзін тыдзень, без дапамогі агенцтва, выкарыстоўваючы толькі інтэрнэт і газеты з аб'явамі.

Сёння інтэрнэт-пляцоўкі па пошуку жылля значна развіліся. Акрамя таго, іх стала больш. Мой пошук пачаўся з банальнага запыту ў браўзеры «знайсці кватэру ў Мінску на працяглы тэрмін без пасярэднікаў». Адразу натыкаешся на мноства сайтаў, якія здольныя падказаць як, дзе і за колькі можна знайсці сабе кут. Рэкамендую сайты Kva.by, domovita.by, kufar.by, kvadrat.by, kvartiradom.by, kvartirant.by, oxl.by і, вядома ж, стары добры onliner з яго барахолкай.

СТАР. 3

■ Беражыце сябе

## З'есці і... не трапіць у бальніцу

Каля 30 працэнтаў грыбоў, што летась спрабавалі прадаваць на рынках, ужываць у ежу было нельга



**Будзьце пільныя ў дачыненні да таго, што і як ясце, інакш проста не пазбегнуць непрыемнасцяў. Любы харчовы прадукт мае тэрмін годнасці. Пагледзіце на этыкетку, і знойдзеце там лічбы — калі прадукт быў выраблены і да якога чысла павінны быць выкарыстаны. Калі гэта малочны прадукт, то там будзе ўказаны нават час вырабу. Вядома, з'есці яго можна і на гадзіну пазней — нічога не здарыцца, аднак агульнае правіла для спажыўца такое: чытайце этыкеткі. Узніклі нейкія падазрэнні, пытанні — задайце іх прадаўцу або адміністратару гандлёвай установы. Усё ж такі бактэрыяльныя атручэнні, асабліва частыя ў летні перыяд — не жарты, аб чым нагадвае вядучы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Васіль ЦЫГАНКОЎ.**

СТАР. 4

**Да 100-годдзя «Звязды» засталося 19 дзён**

## На ўсе 100!!!

За без дваццаці дзён векавую гісторыю звяздоўцы не страцілі энтузіязму і азарту! Мы запрашаем вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на актыўнае свята, дзе вы зможаце паспаборнічаць у гіравым спорце і варкаўце, паўдзельнічаць у майстар-класах ад рэкардсмена Гінеса (аўтара больш як 100 сілавых рэкордаў!) Вячаслава Харанекі і ўбачыць гульню найлепшага міні-футбольнага клуба краіны «Сталіца»!

Вас чакае мора спартыўнага драйву, падарункі ад газеты «Звязда», аўтограф-сесія са знакамітымі спартсменамі, фотазона, прыемная музыка і сяброўская атмасфера!

**Свята адбудзецца ў суботу 29 ліпеня на спартыўнай пляцоўцы сталічнага Ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**

**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**

## ПАТЭНЦЫЯЛ ВЯЛІКІ

**Як ужо паведамлялася, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з афіцыйным візітам ва Украіну. Адно з пытанняў парадку дня візіту — абмеркаванне з Прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам развіцця двухбаковага супрацоўніцтва, у тым ліку гандлёва-эканамічнага.**




## Прысутнасць айчынных IT-кампаній у ЗША пашыраецца

**Аб'ём «лічбавага» экспарту ў ЗША па выніках 2017 года павінен вырасці на 20% і тым самым перавысіць адзнаку ў 450 млн долараў.**

Паводле слоў **часовага паверанага ў справах Беларусі ў ЗША Паўла ШЫДЛОЎСКАГА,** летась аб'ём экспарту паслуг у ЗША склаў 400 млн долараў, 95% з якіх прыходзіліся на сферу інфармацыйных тэхналогій. Ён таксама адзначыў, што ўсё больш прадстаўнікоў IT-бізнесу з Беларусі выходзяць на амерыканскі рынак. Іх агульнай тэндэнцыяй з'яўляецца арыентаванасць на работу ў кірунку стварэння ўласнага праграмнага прадукту, а не аказання аўтсорсінгавых паслуг. Станоўчай тэндэнцыяй у развіцці супрацоўніцтва дзвюх краін таксама з'яўляецца і тое, што на нацыянальнай экспазіцыі Беларусі ў Маямі дзелавая супольнасць ЗША і кіраўнікі ўстаноў адукацыі праявілі цікавасць да наладжвання кантактаў у IT-сферы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

## Парламенцкі дзённік

## ВЫНІКІ МАДЭРНІЗАЦЫІ

### падвёў Міхаіл Мясніковіч падчас рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць

Учора старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч асабіста ацаніў абнаўленне Баранавіцкага вытворчага баваўнянага аб'яднання. Затым ён пераехаў у Ляхавічы, дзе правёў прыём грамадзян.

— Праект мадэрнізацыі аб'яднання досыць эфектыўны, вынікі добрыя. Летась тэмп росту па аб'ёмах вытворчасці і продажаў быў каля 125%, экспарт вырас больш чым на 30%. За першае паўгоддзе 2017-га аб'ёмы прырaслі яшчэ на 30%, экспарт — у 1,6 раза да такога ж перыяду 2016 года. Гэта сведчыць пра тое, што прадукцыя запатрабавана як на ўнутраным, так і на знешніх рынках, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

На нарадзе, якую правёў старшыня Савета Рэспублікі, разглядзелі фінансавыя магчымасці прадпрыемства ў 2018 і 2019 гадах. Адзін з асноўных выдаткаў — крэдыт на мадэрнізацыю, які неабходна будзе за гэты час пагасіць. Па ўказе ў абнаўленне Баранавіцкага ВБА было ўкладзена 20 млн еўра, яшчэ каля 10 млн еўра прадпрыемства прыцягнула самастойна. Зараз БВБА выйшла на ўстойлівы эканамічны ўзровень: каля трацiны прадукцыі аб'ёмаў 2018 года ўжо закантрактаваная. У планах — нарасціць аб'ёмы швейнай вытворчасці і выраблаць касцюмныя і кашульныя тканіны.

На прыём да Міхаіла Мясніковіча ў Ляхавічах прыйшло пяць чалавек. Старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што практычна ўсе пытанні можна было б вырашыць на мясцовым узроўні, але некаторыя кіраўнікі баяцца браць на сябе адказнасць.

Да таго ж Міхаіл Мясніковіч паведаміў, што зараз заканчваецца падрыхтоўка шэрагу нарматыўна-прававых актаў, якія дазволяць спрасціць адміністрацыйныя працэдуры па вядзенні бізнесу. Удасканаляць, магчыма, і інвестыцыйнае заканадаўства, каб стварыць больш камфортныя ўмовы для тых, хто жадае ўкладваць грошы ў беларускія прадпрыемствы.

## УМАЦАВАННЕ КАНТАКТАЎ

### Уладзімір Андрэйчанка прапанаваў актывізаваць адносіны з іранскімі парламентарыямі

Пра гэта ішла размова падчас сустрэчы старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзіміра Андрэйчанкі з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Ірана ў Беларусі Мастафой Авейсі.

Спікер ніжняй палаты нагадаў, што для пашырэння двухбаковага супрацоўніцтва была створана рабочая група. Ён адзначыў: «На мой погляд, дэпутаты гэтай групы не падключаны да работы змешанай беларуска-іранскай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве. А гэта трэба было б зрабіць абавязкова. Тое будзе толькі на карысць і Беларусі, і Ірану».

Патэнцыял для развіцця існуе і ў міжрэгіянальным супрацоўніцтве, у тым ліку па лініі гарадоў-пабрацімаў. Ужо ёсць прыклады заключэння двухбаковых дагавораў паміж рэгіёнамі, але плённай работы пакуль не назіраецца.

Налета Беларусь і Іран будуць святкаваць 25-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін. Можна адзначыць пэўныя поспехі ў эканоміцы за гэты час. За чатыры месяцы гэтага года тавараабарот склаў $48 млн, у той час як за ўвесь 2016 год гэты паказчык ненашмат перавысіў $50 млн.

Уладзімір Андрэйчанка павіншаваў Мастафу Авейсі з пачаткам яго дыпламатычнай місіі ў Беларусі і пажадаў, каб работа дыпламата была плённай.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

## Прарыў у фармацэўтыцы

## ЛЕКІ, ЯКІХ У НАС ЯШЧЭ НЕ БЫЛО

**У Бешанковічах Віцебскай вобласці адбылося афіцыйнае адкрыццё міжнароднага навукова-вытворчага комплексу «Націвіта», скіраванага на выраб і вывад на рынак сучасных генерычных прэпаратаў і біяналагаў, а таксама на ўдзел у распрацоўцы і рэгістрацыі абсалютна новых — прарыўных — інавацыйных прэпаратаў, якія істотна зменяць тэрапію цяжкіх анкалагічных захворванняў — раку малочнай залозы, лёгкіх, страўніка, скуры і іншых. Сёлета плануецца пачаць рэгістрацыю лекавых сродкаў у краінах ЕўразЭС.**

Такой вытворчасці няма больш нідзе ў нашай краіне. Яна называецца ізаляванай, таму што фактычна апаратар на лініі і актыўныя рэчывы не ўзаемадзейнічаюць адно з адным, а кантактуюць праз камп'ютар ды абсталяванне. Ізаляваныя ўчасткі вытворчасці лекавых прэпаратаў ёсць і на некаторых іншых фармпрадпрыемствах, аднак ізаляцыя «ад» і «да» — гэта ўпершыню.

Сучасны высокатэхналагічны комплекс спраектаваны і створаны з удзелам экспертаў-кансультантаў краін Еўрапейскага саюза і СНД. «Націвіта" выраблае лекавыя сродкі — у таблетаванай, капсульнай і вадкай формах — па поўным цыкле паводле патрабаванняў еўрапейскага стандарту GMP.


Фота БЕЛТА.

— Мы хацелі мець вытворчасць паводле міжнародных стандартаў і арыентавацца на знешні рынак, — адзначае **старшыня савета дырэктараў СТАА «Націвіта» Аляксей СЫЧОЎ**. — У зоне нашых інтарэсаў выраб інавацыйных прадуктаў — біяналагаў і першых генерыкаў, што дазволіць эканоміць грашовыя рэсурсы. Паколькі ў Еўразаюзе іншыя патрабаванні да рэгістрацыі, чым у Беларусі, то мы цяпер актыўна працуем над рэгістрацыйнымі дасье сямі прадуктаў, якія плануем да канца года асвоіць па поўным цыкле. У першую чаргу яны будуць рэгістравацца ў Славакіі, а далей у іншых еўрапейскіх краінах. На снежань — студзень запланавана інспекцыя агенцтва лекаў Славакіі, пасля чаго першыя тры прадукты будуць пададзены на рэгістрацыю ў гэтай краіне. Акрамя таго, на ўзроўні ўрадаў нашых краін падтрымліваецца сумесны навуковы праект па распрацоўцы персаніфікаваных вакцын для прафілактыкі і лячэння раку лёгкага і малочнай залозы. Магчымасць стварэння індывідуальных вакцын у комплексе са стандартнай схемай лячэння дазваляе дабіцца лепшага выніку. Па раку малочнай залозы ўжо зараз можна прагназаваць рост выпадкаў адсутнасці рэцыдываў у 2—3 разы. «Націвіта» рэалізуе гэты праект разам з РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, Віцебскім медуніверсітэтам і славацкім навукова-даследчым цэнтрам BioMed...

Другі праект — развіццё і ўкараненне тэхналогіі геннай тэрапіі пухліннага працэсу. Наогул у свеце толькі дзве краіны праводзяць сёння даследаванні падобнага кшталту — Кітай і Японія. Размова ідзе пра стварэнне персаніфікаваных вакцын з выкарыстаннем геннай інжынерыі. З дапамогай спецыяльнай сістэмы рэдагавання геному можна аднавіць «паламаны» геном і спыніць рост пухліны і метастазаў, што разам з прымяненнем стандартнага супрацьпухліннага лячэння істотна падоўжыць жыццё.

Сумесна з Віцебскім медуніверсітэтам «Націвіта» стварае таксама фармацэўтычны кластар і цэнтр фармдаследаванняў. З'явяцца цэнтр даклінічных іспытаў, віварый, лабараторыі малога хімічнага сінтэзу, інжынірынгавы цэнтр для адпрацоўкі вытворчых тэхналогій, працягне развівацца сучасная лабараторыя, дзе можна будзе праводзіць аналізы кантролю якасці па ўнікальных для краіны методыках. Сёлета фармкластар атрымлівае дзяржаўнае фінансаванне ў памеры 1 млн еўра. У кампаніі спадзяюцца, што дзяржава і надалей будзе актыўна падтрымліваць праекты, звязаныя з развіццём навукі, навуковымі даследаваннямі.

— У грамадстве замацаваўся стэрэатып, што айчыннае горшае, чым выраблянае ў Еўропе. Усё залежыць ад абсталявання, ад таго, як адладжаны працэс вытворчасці, — кажа Аляксей Сычоў. — Акрамя таго, за апошнія гадоў дзесяць тэхналогіі настолькі змяніліся, што ў сучасных умовах можна вырабіць першы генерык нават больш якасны, чым арыгінальны прэпарат, запатэнтаваны 10—20 гадоў таму...

Лекавыя прэпараты дзеляцца, як вядома, на арыгінальныя і генерычныя, або джэнерычныя. Генерык — гэта падобны на арыгінал прадукт. Розніца паміж імі толькі ў тым, што арыгінальны мае патэнтную абарону. У сярэднім патэнт дзейнічае з моманту падачы дакументаў каля 15—20 гадоў. Усе краіны свету зацікаўлены ў з'яўленні генерыкаў, таму што гэта зніжэнне нагрузкі на бюджэт. Такім чынам у нашай краіне стала магчымым рэгістраваць і прымяняць прадукты, якія раней не прымяняліся з-за свайго высокага кошту.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Арабская чацвёрка ўдвая ўрэзала спіс патрабаванняў да Катара



Чацвёрка арабскіх краін, якія разарвалі дыпламатычныя адносіны з Катарам і ўзначалілі байкот супраць яго, больш не настойвае на выкананні дзяржавай 13 патрабаванняў, прад'яўленых яму ў мінулым месяцы ў форме ўльтыматуму. Цяпер Саудаўская Аравія, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Бахрэйн і Егіпет хочуць ад Дохі захавання шасці агульных прынцыпаў. У гэтыя патрабаванні ўваходзяць абавязацельствы па барацьбе з тэрарызмам і экстрэмізмам, а таксама спыненне актаў правакацый і падбухторвання. Як заўважыў пастаянны прадстаўнік Саудаўскай Аравіі Абдула аль-Муалем, саступкі па гэтых палажэннях немагчымыя.

### Пры ўзяцці Масула загінула 40 тысяч мірных жыхароў

Больш за 40 тысяч мірных жыхароў загінула падчас бітваў за вызваленне іракскага горада Масула ад баевікоў «Ісламскай дзяржавы», піша газета Independent са спасылкай на інфармацыю курдскай разведкі. Адначаецца, што месцічы сталі ахвярамі баевікоў, іракскіх войскаў, а таксама авіяабстрэлаў. Як заявілі ў ААН, на ўтрыманне жыхароў, якія застаюцца па-за межамі горада пасля яго вызвалення, можа спатрэбіцца да 450 мільёнаў долараў. Па звестках арганізацыі, на аднаўленне базавай інфраструктуры Масула прыйдзецца выдаткаваць 1 мільярд долараў ЗША.

### Урад Калумбіі ў поўным складзе падаў у адстаўку

Кабінет міністраў прэзідэнта Калумбіі Хуана Мануэля Сантаса ў поўным складзе падаў у адстаўку, каб дапамагчы кіраўніку дзяржавы сфарміраваць новую каманду. Як заявіў генеральны сакратар адміністрацыі прэзідэнта Альфонса Прада, прэзідэнту паведамілі пра рашэнне ў лісце, падпісаным усімі міністрамі, кіраўнікамі адміністрацыйных ведамстваў і іншымі высокапастаўленымі службовымі асобамі. Сам прэзідэнт яшчэ не паведаміў, хто з міністраў пакіне сваю пасаду.

### Улады Гаіці пачалі аднаўленне распушчанай больш за 20 гадоў таму арміі



Армія Гаіці была распушчана ў 1995 годзе па загадзе прэзідэнта Жан-Бертрана Арыстыда, які за чатыры гады да таго быў скінуты ў выніку ваеннага перавароту. З таго часу за бяспеку адказвае нацыянальная паліцыя, якая налічвае каля 15 тысяч чалавек. У пачатку ліпеня міністр нацыянальнай абароны Гаіці Эрве Дэні паведаміў пра намер узнавіць узброеныя сілы. Плануецца, што новая армія будзе складацца з 500 чалавек ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў. Прэзідэнт Гаіці Жавенэль Маіз падтрымаў ідэю стварэння арміі. Між тым праціўнікі гэтага рашэння сцвярджаюць, што ўзброеныя сілы стануць дадатковай нагрузкай на бюджэт краіны, якога і так не хапае на забеспячэнне адукацыі і аховы здароўя, а таксама ўтрыманне нацыянальнай паліцыі.

## Асцярожна — вада!

# НЕДАРЭЧНАСЦІ ДА БЯДЫ ДАВЯЛІ

**Адразу два трагічныя выпадкі на вадзе адбыліся ў Гродзенскай вобласці. У Гродне 15-гадовы юнак, які не ўмеў плаваць, патануў у мелавым кар'еры, а ў Свіслачы мужчына стаў ахвярай вады з-за... «рыбнага» месца.**

Трагедыя з юнаком А. адбылася днём 19 ліпеня. Паведамленне аб трагічным здарэнні паступіла ратавальнікам у 14 гадзін 2 хвіліны. Але яшчэ паўтары гадзіны спатрэбілася вадалазам, каб знайсці цела юнака. Яго ўзнялі на паверхню ў 15.28. Тапелец быў вучнем 9-га класа СШ №7 горада Гродна.

Як паведаміў начальнік аддзела вадалазна-выратавальнай службы Гродзенскага аддзялення таварыства выратавання на водах Юрый Касцевіч, група хлапчукоў разам з загінуўшым часта прыходзілі адпачываць на кар'ер і нават абсталявалі там «сваё» месца — выклалі камянямі, расчысцілі, паставілі лаўкі. Сюды яны прыйшлі пасля таго, як паплавалі на Нёмане — у аднаго з падлеткаў быў дзень нараджэння, і яны вырашылі адпачыць яшчэ і на кар'еры. Першым пабег А., ён сказаў, што хоча акунуцца, хоць і не ўмеў плаваць. Калі падышлі астатнія, яны ўбачылі толькі адзенне на траве. Хлопцы пачалі ныраць, але безвынікова. Цела выцягнулі супрацоўнікі манеўрова-пошукавага атрада праз паўтары гадзіны недалёка ад берага, на глыбіні шасці метраў.

Вядома, што хлопец жыў з бацькам і дзядулем. Яго маці загінула на пажары.

Якраз у гэты дзень у школе павінны былі адбыцца спартыўныя спаборніцтвы, на якія збіраліся прыйсці і падлеткі разам з А. Многія бацькі ведалі, што іх дзеці ідуць на кар'ер.

Гродзенскія кар'еры некалі былі папулярныя ў жыхароў абласнога цэнтра, яны знаходзяцца ў межах горада і нават атрымалі назвы «Сінька» ды «Зялёнка». Сюды і цяпер прыходзяць на адпачынак і купаюцца, хоць практычна кожны год тут адбываюцца трагічныя выпадкі з-за стану кар'ераў: нестабільнае дно, глыбіня больш за 20 м, крутыя спускі.



Яшчэ адзін трагічны выпадак днямі адбыўся ў горадзе Свіслачы. Ахвярай вады стаў 39-гадовы мужчына. Ён каля дзевяці гадзін вечара ехаў на веласіпедзе ўздоўж вадаёма і заўважыў, што на супрацьлеглым беразе хлопцы ловяць рыбу. Як пазней паведамілі рыбакі, гэта месца было даўно аблюбавана ахвярай. Ён тут часта лавіў і падкормліваў рыбу, таму вырашыў прагнаць хлопцаў. Злез з веласіпеда, раздзеўся і паплыў на супрацьлеглы бераг, а калі пачалася глыбіня — нырнуў. Вынырнуць не змог. Знайшлі цела вадалазы толькі каля дзвюх гадзін ночы. Такім жудасным вынікам абярнулася жаданне мужчыны сагнаць дзяцей з быццам бы «рыбнага» месца.

Як паведамілі ў Таварыстве выратавання на водах, з пачатку года ў вобласці патанула 17 чалавек, з іх адзін непаўналетні.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# МІСІЯ ВЫКАНАЛЬНАЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Кажучы аб бюджэтным сегменце арэнднага жылля, варта адзначыць, што добрых прапаноў пакуль што хапае. Так, прааналізаваўшы сайты, можна знайсці аднапакаёўку за 150—250 у.а. у месяц. Двухпакаёвую кватэру прапануюць у сярэднім за 230—300 у.а. Трохпакаёўка ў сталіцы здаецца за 270—350 у.а.

За такія сумы можна атрымаць, як правіла, інтэр'ер, які будзе нагадваць пра 70—80-я гады, радзей з «еўрарамонтам». Таксама ў гэты кошт уваходзіць мэбля, тэлевізар, кухонная тэхніка і нават пральная машына (рэдка). Чым больш абстаноўка будзе нагадваць савецкую эпоху, тым большая верагоднасць у выглядзе бонусу атрымаць добрую бібліятэку рускай і замежнай класічнай літаратуры. Варта адзначыць, што ў гэтым цэнавым сегменце кошт кватэр залежыць ад аддаленасці ад метро (як правіла чым далей, тым танней) і аддаленасці ад цэнтра горада (аналагічна). Калі гаварыць пра арэнду пакоя, то гэта можа абысціся ў суму ад 80 да 150 у.а.

У сваю чаргу кошт VIP-сегмента не залежыць ад размяшчэння жылплошчы. Напрыклад, шасціпакаёвая кватэра на вуліцы Сасновы Бор можа абысціся ў 3000 у.а. у месяц. Там будзе не толькі ўся мэбля, кухонныя прыборы, пральная машына, плазменны тэлевізар, але ўсё гэта яшчэ будзе падпарадкоўвацца пэўнай дызайнерскай ідэі. Таксама ў прыклад прывяду трохпакаёвую кватэру на вуліцы Піянерскай, якая абыдзецца ў 1750 у.а., і на вуліцы Леніна за 2500 у.а. Па фатаграфіях абстаноўка там шыкоўная. Кошт мала залежыць ад размяшчэння яшчэ і таму, што арэнда такой кватэры мае на ўвазе наяўнасць добрага аўтамабіля, для якога хутчэй за ўсё будзе прадастаўлена стаяначнае месца побач з жыллём.

## НА ЖЫЎЦА

Выдаткаваўшы час на вывучэнне прапаноў у сетцы інтэрнэт, я вылучыў для сябе некалькі варыянтаў, якія б мяне зацікавілі па цане і якасці. Аднак перада мной паўстала яшчэ адна праблема. У шэрагу выпадкаў, калі тэлефанаваў уласніку кватэры, сутыкаўся з прадстаўнікамі агенцтваў. Прычым, калі прасіў паказаць мне менавіта гэтую кватэру, агенты часта казалі, што яна ўжо здадзена, але яны могуць мне дапамагчы знайсці аналагічную жылплошчу ў тым жа раёне нават па больш нізкай цане. Праўда, перад гэтым я павінен прыехаць да іх і заплаціць пэўную суму.




Падобныя аб'явы з фотаздымкамі добрай па цане і інтэр'еры кватэры могуць «вісець» у сетцы месяцамі. Гэта сапраўды эфектыўны «шэры» спосаб для агенцтваў завабіць кліентаў. Разам з тым, калі нават і скарыстацца іх паслугамі, часцей гэты варыянт будзе нагадваць латарэю — грошы заплаціш і зусім не факт, што атрымаеш жаданае. Дарэчы, пры фарміраванні запыту ў пошукавіку варта дадаваць «без пасярэднікаў». Так на агентаў натыкаешся радзей. У выніку я знайшоў пару варыянтаў, якія б мяне задаволілі. Мне пашанцавала, бо і фатаграфіі ў інтэрнэце былі рэальнымі, у чым упэўніўся, калі зайшоў у кожную з кватэр. Аднак бывае і так, што вывешваюць у сеціва адно, а на справе чагосьці ўжо можа і не хапаць. Гэта таксама — латарэя.

## ТРОХІ ПРАГНОЗАЎ

Прадказваць сітуацыю на рынку жылля — справа няўдзячная. Улічыць усе эканамічныя фактары вельмі складана нават для аналітыкаў. Разам з тым **начальнік аддзела арэнды жылля «Твая сталіца — Агенцтва нерухомасці» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ** яшчэ ў пачатку лета для realt.by адзначыла, што за год цэны на арэнду глабальна не змяніліся, і вялікага ўсплёску ў жніўні-верасні мы таксама не ўбачым.

«Як такога «студэнцкага буму» хутчэй за ўсё не будзе. Як заўсёды, чакаецца звычайны працэнт прыезджых студэнтаў, якім не дасталося месца ў інтэрнаце, і яны будуць шукаць кватэры, але глабальна гэта на цэны не паўплывае», — лічыць спецыяліст.

Рынак арэнды ў Мінску завязаны не толькі на студэнтаў, мяркуе рыэлтар. «Ёсць яшчэ і тыя, хто скончыў універсітэт і застаецца ў сталіцы. Нямала людзей проста едуць з рэгіёнаў уладкоўвацца на працу ў Мінск. Часцей уся гэтая актыўнасць назіраецца ў верасні. Мы чакаем невялікі рост, але хутчэй у жніўні, чым у верасні. Цэны могуць неістотна падвысіцца, але, па нашых прагнозах, не больш, чым на 5%. Гэта значыць, калі цяпер сярэднюю па спажывецкіх якасцях аднапакаёўку можна зняць за 150 у.а., яна падаражэе да 155—160 у.а. у месяц», — рэзюмавала Маргарыта Пачыцкая.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

## Ну і ну!

# Паліцыя знайшла веласіпед, украдзены 14 гадоў таму

**Супрацоўнікі паліцыі Эстоніі знайшлі веласіпед, украдзены з балкона шматкватэрнага жылога дома ў горадзе Тырва 14 гадоў таму, паведамляе «Інтэрфакс».**

Паводле інфармацыі, у 2003 годзе ўладальніца веласіпеда заявіла ў праваахоўныя органы аб згубе, паказаўшы нумар рамы. У той час знайсці двухколавы транспарт не ўдалося, аднак не так даўно яго знайшлі ў Валзе, пра што паліцыя апавясціла пацярпелую па гэтай справе. «Жанчына была вельмі здзіўленая, што веласіпед вернецца да яе. Тым больш што напярэдадні сям'я планавала куплю новага веласіпеда і ўпершыню за доўгі час абмяркоўвала прапажу старога. Сям'я нават пажартавала, што, магчыма, няма сэнсу купляць новы веласіпед, раптам хутка вернуць стары. З гэтай нагоды іх тым больш уразіла радасная вестка пра знойдзены веласіпед, якая паступіла на наступны дзень ад паліцыі», — расказаў прадстаўнік праваахоўных органаў Марэк Кяйс.

## УЛАДА НА СУВЯЗІ

**Заўтра, 22 ліпеня, на традыцыйных прамых лініях у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме, якія штотыдзень праходзяць па суботах з 9.00 да 12.00, на звароты і пытанні грамадзян будуць адказваць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама ТОКАР Мікалай Васілевіч. Тэл. 8 (016) 2213121;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама ГРЭБНЕЎ Генадзь Іванавіч. Тэл. 8 (021) 2222222;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч. Тэл. 8 (023) 2751237;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама ПАПОЎ Ігар Андрэевіч. Тэл. 8 (015) 2735644;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама ЧЫКІДА Алег Іванавіч. Тэл. 8 (022) 2501869;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама ГУРЫНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч. Тэл. 8 (017) 5004160;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч. Тэл. 8 (017) 2224444.

## Надвор'е

# Лета прыйшло, разам з ім — навальніцы

**На выхадных тэмпература наблізіцца да кліматычнай нормы, але разам з тым у краіну прыйдуць дажджы.**



Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. У суботу ў асобных раёнах краіны можа выпасці град.

Сёння, у пятніцу, у Беларусі захаваецца цёплае надвор'е, толькі па поўдні краіны ў асобных раёнах пройдуць дажджы, месцамі — навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 8 градусаў цяпла па поўначы да 18 на поўдні. Днём паветра прагрэецца да 21—27 градусаў, а на поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей слупок тэрмометра можа дасягнуць адзнакі «30».

У суботу поўдзень краіны застанецца пад уплывам франтальнага раздзелу, чакаецца няўстойлівае надвор'е. Уначы па ўсёй тэрыторыі краіны за выключэннем поўначы, а ўдзень па паўднёва-ўсходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы, у асобных раёнах можа выпасці град. У цёмны час сутак прагназуецца ад 9 да 16 градусаў цяпла, удзень — 19—26, на поўдні краіны паветра ўначы прагрэецца да 17—19, днём — да 27—30 цяпла.

У нядзелю атмасферныя франты пакінуць тэрыторыю Беларусі, адпаведна, усталюецца цёплае і спакойнае надвор'е пераважна без ападкаў, толькі па поўдні магчымы кароткачасовыя дажджы. Уначы будзе 9—16 цяпла, па поўдні — да 18, удзень 22—29 градусаў. Уначы і ранкам слабы туман.

Паводле папярэдніх прагнозаў, пачатак наступнага тыдня зноў будзе неспакойны, бо ў краіну прыйдзе актыўны атмасферны фронт з тэрыторыі Заходняй Еўропы. У панядзелак ноччу па паўднёвым захадзе пройдуць дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Тым не менш надвор'е застанецца цёплым.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

## Тым часам

### У Германіі ад стыхіі пацярпеў беларус

На беларускага кіроўцу ў Германіі звалілася фура. Здарэнне адбылося непадалёк ад горада Магдэбурга падчас урагану. Хуткасць ветру дасягала 140 кіламетраў за гадзіну. Як бачна на апублікаваным у сеціве відэа, моцны парыў перакуліў прыпаркаваны аўтамабіль разам з прычэпам, апошнім і прыціснула дальнабойшчыка. Як паведамляюць у кампаніі, дзе працуе пацярпелы, мужчыну са шматлікімі пераломамі, у тым ліку таза, даставілі ў мясцовую клініку на «хуткай». Там кіроўцу аказалі неабходную дапамогу, правялі аперацыю. Пасля дазволу нямецкіх дактароў на транспарціроўку беларуса ў суправаджэнні медработніка спецтранспартам даставілі ў НДІ траўматалогіі ў Мінску, дзе ён цяпер праходзіць лячэнне. Прагнозы медыкаў станоўчыя, дапамогу ў далейшай рэабілітацыі акажа прадпрыемства, дзе працуе пацярпелы.

**Уважаемые акционеры ОАО «Стройтрест №1»!**

**7 августа 2017 г. в 14.30 в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 15 состоится внеочередное общее собрание акционеров.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О выплате дивидендов за первое полугодие 2017 года.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, — 1 августа 2017 года.

Регистрация участников собрания 7 августа 2017 года с 13.30 до 14.00. Для регистрации при себе иметь: акционеру Общества — паспорт; представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 100288960

# З'ЕСЦІ І... НЕ ТРАПІЦЬ У БАЛЬНІЦУ

## ТЭРМІН ГОДНАСЦІ ПІРАЖКА

— Пратэрмінаваныя прадукты не павінны знаходзіцца на прылаўках, і гэта спецыяльна адсочваецца ў арганізаваным рознічным гандлі, — гаворыць спецыяліст. — Аднак калі вы раптам заўважылі, што гэта не было зроблена, то маеце поўнае права звярнуцца да адміністратара, растлумачыць сітуацыю, запытаць «Кнігу прапаноў» і пазначыць там факт знаходжання ў продажы пратэрмінаванага прадукту. Паверце, што сітуацыю паспрабуюць выправіць тут жа. Калі ж вы купілі, скажам, малако, прынеслі яго дадому і толькі там высветлілі, што яно сапсавалася, значыць, вярніцеся ў магазін з гэтым прадуктам. Ніхто з вамі спрачацца не будзе — грошы вернуць адразу. І калі кожны будзе такім адказным і прынцыповым, то і падобных прэцэдэнтаў стане мізэр.

**— Фрукты могуць хутка губляць таварны выгляд, што бачна нават няўзброеным вокам. Асабліва засмучаюць счарнелыя бананы... Хіба можна наогул прадаваць такую непрэзэнтабельную прадукцыю?**

— Знешні выгляд яшчэ не сведчыць аб наяўнасці шкоднай мікрабіялогіі — з гэтым можа быць усё ў парадку. Для кожных фруктаў ёсць свае дапушчальныя моманты.

**— Ці праўда, што перад ужываннем неабходна абдаваць кіпенем фактычна ўсе фрукты-ягады?**

— Старанна мыць трэба ўсё, нават тыя ж бананы. А калі абдаць кіпенем ягады, баюся, ад іх нічога не застанецца. Пакладзіце ягады на друшляк і доўга памыйце вадой з-пад крана.

**— Да якіх страў, што прапануюць нам аддзелы кулінарыі, варта ставіцца з асаблівай асцярожнасцю?**

— Там дзейнічаюць свае санітарна-гігіенічныя нормы, якія рэгулююць час знаходжання гатовых прадуктаў на прылаўках. Усё, што прыгатавана сёння, годнае да ўжывання да канца працоўнага дня. Галоўнае, каб такая прадукцыя захоўвалася ў халадзільніках. Безумоўна, вы маеце права і дадаткова запытаць, калі быў прыгатаваны салат, катлета, піражок і г. д. і колькі ў яго тэрмін годнасці. Калі прадавец не можа даць вам адказ, значыць, трэба размаўляць з адміністратарам. Любыя падазрэнні трэба знімаць, таму што пакупнік рызыкуе не толькі сваімі грашыма, але і здароўем, а то і жыццём. Наогул калі вы купляеце гатовыя кулінарныя прадукты, то ешце іх у той жа дзень, не рабіце дома ці на рабоце запасаў.

**— Самы летні прадукт — марожанае — можа ўяўляць для нас нейкую пагрозу?**

— Як і ў любым іншым прадукце пры няправільным захоўванні там можа быць патагенны залацісты стафілакок, здольны прывесці нас на бальнічны ложак. З той жа прычыны нельга піць малако з-пад каровы, без тэрмічнай апрацоўкі, бо і сама карова, і рукі даяркі або даільны апарат — не стэрыльныя. А таму халадзільнае абсталяванне, у якім знаходзіцца марожанае і любыя малочныя прадукты, павінна працаваць як належыць. Калі ў магазіна ёсць праблемы з халадзільнікамі, то і марожанага не можа быць у продажы.

## З-ПАД КРАНА МОЖНА ПІЦЬ

**— Як будзем засцерагацца ад харчовага атручэння ў хатніх умовах?**

— Будзем вытрымліваць правілы асабістай гігіены — мыць рукі перад ядой, пасля вуліцы і г. д. Будзем правільна захоўваць прадукты ў халадзільніку: мяса, рыбу, гародніну, гатовае і сырое пакладзём асобна. Рыба і мяса, напрыклад, заўсёды захоўваюцца на ніжніх паліцах, каб якая-небудзь кропля соку з іх не ўпала зверху на торт ці сыр.

**— Будзем піць ваду з-пад крана або ўсё ж такі бутыляваную?**

— У нашых кранах — нармальная пітная вада, успышак захворванняў, звязаных з ужываннем такой вады, у Беларусі няма. Калі вам перашкаджае пах хлору, значыць, можна наліваць ваду ў ёмістасць і даваць адстаяцца. Я асабіста п'ю ваду з-пад крана. Можна набываць і бутыляваную, але з фізіялагічнага пункту гледжання яе нельга назваць якаснай, бо ў ёй не хапае мікраэлементаў. Трэба адрозніваць паняцці бяспекі і бясшкоднасці. Тая ж вада з-пад крана бяспечная, яна не нясе пагрозы нашаму жыццю, але нясе шкоду арганізму, бо там ёсць хлор, і таму мы кажам, што гэта вада небясшкодная. У продажы ёсць сталовая, лячэбна-сталовая і лячэбная вада. Назвы абазначаюць ступень мінералізацыі. Лячэбная мае мінералізацыю звыш 10 г на 1 л, лячэбна-сталовая — ад 1 да 10 г на 1 л і сталовая — да 1 г на 1 л. Нам неабходна сталовая вада, зрэдку можна выпіваць і тыя, што маюць большую мінералізацыю, але штодня нам патрэбна звычайная пітная вада. Сёння кажуць пра фізіялагічны стан вады, маючы на ўвазе яе pH, набор неабходных мікраэлементаў і г. д. Такая вада — у прыродных артэзіянскіх крыніцах, дзе ёсць ідэальны набор мінеральных солей. Іх дэфіцыт шкодзіць нашаму здароўю. Бо калі з тканак і крыві дысціляванай вадой вымываюцца рэшткі мінералаў, з'яўляцца ацёчнасць, а ўрэшце ўзнікне і пагроза жыццю.

## ПЕРАКУС НА ПРЫРОДЗЕ

**— Пачаўся сезон грыбоў-ягад, іх столькі прадаюць уздоўж трас...**

— Прадукты, якія прадаюцца з рук, — грыбы-ягады ў тым ліку, набываць нельга. А праведзены летась маніторынг рынкаў паказаў, што каля 30 працэнтаў грыбоў мелі павышаны ўзровень радыяцыі. Купляць жа і пасля правяраць самім — не варыянт. Вы



нямала заплаціце за самі грыбы, на само даследаванне іх спатрэбіцца дзесяці кілаграм, дый заплаціць за яго таксама давядзецца. Тым, хто любіць збіраць грыбы-ягады для ўласнага спажывання, я рэкамендую глядзець карту радыяцыйнага забруджання. Яна рэгулярна абнаўляецца, і вы ўбачыце, у які раён ехаць не варта. Што да рынкаў, то на іх павінны быць кантроль, аднак шчысці можа праскочыць і там. Вядома, ад таго, што вы з'ясце кілаграм грыбоў ці ягад за сезон, нічога не здарыцца, аднак пастаянна іх ужываць не варта. Грыбы — не асноўны прадукт харчавання. Сёння спакойна можна набываць шампіньёны, вешанкі, замарожаныя баравікі замежнай вытворчасці...

**— Што ўзяць з сабой на пікнік, каб усе вярнуліся з яго здаровыя і задаволеныя?**

— Не бярыце з сабой маянэз, соусы, малочнае... На прыродзе трэба штосьці хутка прыгатаваць і адразу з'есці. У першую чаргу мы кажам пра шашлык, для якога лепшы марынад — цыбуля, перац і соль. Можна дадаць крыху лімоннага соку ці воцату, але зусім крышку. Можна пару лыжак віна. Загадзя дома мыем гародніну, раскладваем па пакетах. Бяром з сабой і дастатковую колькасць чыстай бутыляванай вады, каб усе маглі памыць рукі. На прыродзе абавязкова глядзім за дзецьмі — каб яны не атруціліся якімі-небудзь неядомымі ягадамі. А калі ўбачылі і сабралі суніцы, чарніцы — і памылі іх перад тым, як з'есці.

**— Ці можна чакаць непрыемнасцяў, калі мы падчас купання заглынулі вады з вадаёма?**

— Стан вады ў вадаёмах адсочвае санэпідслужба — важна, каб не было вялікай колькасці патагенных мікраарганізмаў. Піць з вадаёма, само сабой, нельга, аднак калі вы заглынулі крышку вады, то нічога з вамі не здарыцца. Усё ж такі нам у дапамогу дадзена імунная сістэма.

## КАЛІ ЎСЁ ПАЙШЛО НЕ ТАК

**— На што трэба звяртаць увагу ў кафэ, рэстаранах?**

— У такіх установах не павінны перасякацца зоны адходаў і свежых прадуктаў. Прасцей кажучы, ежу вам выносяць праз адны дзверы, а брудныя талеркі нясуць у іншыя... Праверка пунктаў грамадскага харчавання паказала, што дзе-нідзе парушаюцца пэўныя санітарныя нормы, і галоўная праблема тут — чалавечы фактар. Калі нешта бянтэжыць — абрус, посуд — звяртайцеся да адміністратара. За апошнія гады ў нас не было доказанага харчовага атручэння, звязанага з няякаснай ежай у грамадскім харчаванні.

**— За мяжой больш ліберальны ці больш жорсткі кантроль у гэтым сэнсе?**

— Многія нашы нормы больш жорсткія, чым у еўрапейскіх краінах. Але там на бяспеку іграе іншы фактар. У нас хлеб вырабляюць буйныя заводы, а там шмат дробных пекараў. І пекары сабе не ворагі. У максімальнай жорсткасці кантролю сэнсу няма, бо ніхто тады не будзе гандляваць. Гандляр павінен



несці адказнасць за тое, чым гандлюе, а вы, як пакупнік, — за тое, што набываеце. Трэба проста ведаць, што ўладарамі свету былі і застаюцца вірусы з бактэрыямі, і да гэтага трэба пастаянна прыстасоўвацца.

**— Дапусцім, штосьці пайшло не так, і мы атруціліся за мяжой. Што рабіць?**

— У вас павінна быць страхоўка, так што ідзіце да ўрача. Калі захочаце даказаць, што атруціліся менавіта гэтым прадуктам, у вас павінен быць сам прадукт, чэк і даволі шмат грошай, каб наняць адваката, які дакажа, што вы атрымалі шкоду для здароўя. З другога боку, калі ў вас не шараговая дыярэя, і аналізы выявілі патагенны стафілакок, урач паведаміць у адпаведную інспекцыю аб выяўленні такой праблемы.

**— А як наконт самадапамогі?**

— Калі вы адчулі сябе дрэнна, паднялася тэмпература, ёсць ваніты або дыярэя, боль у страўніку, то ніякіх народных сродкаў, ніякай гарэлкі з перцам! Можна выпіць разбаўленай марганцоўкі — вадкасць павінна быць крыху ружовага колеру. Гэта дапаможа выклікаць ваніты і ачысціць страўнік. Але самае важнае — паказацца ўрачу. Асабліва ,калі размова ідзе пра дзіця. На «хуткай» вас даставяць у інфекцыйную бальніцу. Не пацвердзіцца штосьці сур'ёзнае, адпусцяць дадому, у іншым выпадку будуць ратаваць вам жыццё. Бо ад інфекцыі можна і загінуць. Калі размова ідзе пра дыярэю, звязаную з нейкай непераноснасцю, або ў вас грып, або проста пераелі, то вядома, можна справіцца самім — з дапамогай лекавых прэпаратаў, якія прадаюцца ў аптэцы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Ведай нашых!

## ПЕРАМОГА ЯК ЛАД ЖЫЦЦЯ

**Гамяльчанін Генадзь Караткевіч чацвёрты раз стаў пераможцам чэмпіянату па спартыўным праграмаванні "Яндэкс. Алгарытм". Дарэчы, у спаборніцтвах сёлета паўдзельнічалі амаль 5 тысяч чалавек.**

Чэмпіянат стартаваў у красавіку і праводзіўся ў сем раўндаў. Удзельнікі рашалі алгарытмічныя задачы, увасаблялі іх у кодзе і загружалі ў тэсціравальную сістэму. Да таго ж сёлета з'явіўся марафонскі раўнд. На ім было прапанавана рашыць аптымізацыйную задачу.

Фінал чэмпіянату адбыўся 18 ліпеня. За дзве з паловай гадзіны трэба было знайсці рашэнні шасці задач. Найлепшым зноў стаў Генадзь Караткевіч. Цяпер ён заканчвае факультэт інфармацыйных тэхналогій і праграмавання Санкт-Пецярбургскага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі. Малады чалавек першы ў рэйтынгу спартыўных праграмістаў CodeForces. На яго рахунку перамогі на расійскіх і міжнародных спаборніцтвах па праграмаванні, уключаючы Google Code Jam, VK Cup, Russian Code Cup і Facebook Hacker Cup.

Другое месца на сёлетнім чэмпіянаце заняў Нікола Ёкіч са Швейцарскай вышэйшай тэхнічнай школы Цюрыха, трэцяе — выпускнік Універсітэта Токіа Макота Саэдзіма. Пераможцам прысуджаны грашовыя прызы ў памеры 300, 150 і 90 тысяч расійскіх рублёў адпаведна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## Будзь у курсе!

## КАБ ПРАВЕРЫЦЬ СЯБЕ...

**Магчымасць скласці ўласнае меркаванне аб змесце і складанасці матэрыялаў сёлетняга цэнтралізаванага тэсціравання хутка з'явіцца ў бацькоў абітурыентаў, настаўнікаў, выкладчыкаў і рэпетытараў. Па традыцыі яшчэ да завяршэння прыёмнай кампаніі ў гандлёвую сетку краіны паступяць зборнікі з тэставымі заданнямі, якія былі прапанаваныя ўдзельнікам ЦТ 2017 года — усе варыянты па ўсіх дысцыплінах.**

Такім чынам кожны зможа пераканацца ў адэкватнасці патрабаванняў, што прад'яўляюцца да абітурыентаў пры правядзенні ЦТ, і параўнаць свае адказы на тэставыя заданні з апублікаванымі ў зборніках.

А ў верасні, як абяцаюць у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў, выйдуць зборнікі тэстаў па 9 вучэбных прадметах, якія змяшчаюць заданні цэнтралізаванага тэсціравання за 2012—2016 гады. З іх дапамогай старшакласнікі і абітурыенты будуць мець магчымасць не толькі сістэматызаваць і самастойна пракантраляваць свае веды, але і прасачыць асноўныя тэндэнцыі ў фарміраванні заданняў цэнтралізаванага тэсціравання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Ну і ну!

## ПАШКОДЗІЛА СУСЕДЗЯМ ДЗЕВЯЦЬ ДЗВЯРЭЙ

**Супрацоўнікі аддзела правапарадку і прафілактыкі Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі 44-гадовую мінчанку, якая падазраецца ў здзяйсненні хуліганства.**

— Жанчына з хуліганскіх намераў пашкодзіла заколкай для валасоў дзевяць уваходных дзвярэй суседзяў. Свой учынак яна растлумачыла непрыязнымі адносінамі да людзей, якія пражывалі побач. Раней яна ўжо неаднаразова прыцягвалася да крымінальнай адказнасці за крадзеж, махлярства і нанясенне лёгкіх цялесных пашкоджанняў, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля ГАНУСЕВІЧ.** — Заведзена крымінальная справа за хуліганства, жанчыне пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да трох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# STAND-UP: сам-насам з мікрафонам

## Колькі парадаў для беларускіх аматараў жанру



**Гумарыстычнымі праграмамі ў жанры stand-up сёння не здзівіш еўрапейскага, расійскага і ўкраінскага тэлегледача. Праекты, асобныя праграмы, цэлыя вялікія ініцыятывы, міжнародныя фестывалі, што доўжацца некалькі дзён, становяцца ўсё больш і больш папулярнымі, прываблiваюць публіку і новых удзельнікаў, а самі стэндаперы ператвараюцца ў зорак экранаў і заканадаўцаў моды на пэўныя кірункі. У Беларусі камедыя stand-up пакуль знаходзіцца толькі на этапе зараджэння. Але ёсць добрыя навіны: у гэтай галіне ўжо заўважныя пэўныя зрухі і дасягненні. А што рабіць, калі больш няма цярпення чакаць асобнай праграмы на беларускім TV, а сэрца просіць іскрыстых жартаў, з'едлівай сатыры ды смелых вобразаў? Мы адшукалі прынамсі некалькі адказаў на гэтае пытанне.**

### Стаць аматарам еўрапейскіх і амерыканскіх шоу ў інтэрнэце

Натуральна, як і ўсе перадавыя з'явы на тэлебачанні, stand-up мае свае карані на захадзе. Лічыцца, што гэты камедыйны жанр зарадзіўся ў Вялікабрытаніі на мяжы XVIII і XIX стагоддзяў. На той час камедыянты выступалі ў складзе вялікай трупы мюзік-холаў поруч з танцорамі, спевакамі, цыркачамі. Першапачаткова выступленні комікаў праходзілі строгую цэнзуру, але ў сярэдзіне XX стагоддзя закон аб тэатры яе цалкам адмяніў, даўшы аматарам жанру поўную свабоду выказвацца на асабістыя, сацыяльныя і палітычныя тэмы. У ЗША зараджэнне stand-up камедыі звязваюць з імем пісьменніка Марка Твэна, а неймаверны росквіт жанру адносяць да пасляваеннага часу. Аднак перыядам «буму» можна лічыць 1970-я гады, калі па ўсёй краіне з'явілася шмат тэматычных клубаў, а сам стэндап стаўся асноўным відам камедыйнага прадстаўлення.

Таму і не дзіўна, што самых яркіх і ў той жа час бязлітасных зорак stand-up варта шукаць у брытанскім і амерыканскім сегментах. Напрыклад, для пачатку можна паглядзець шоу Луі Сі Кея, Біла Косбі ці Эндзі Мёрфі.

### Звярнуць увагу на расійскія і ўкраінскія шоу

Праекту StandUp Show на расійскім канале ТНТ ужо больш як пяць гадоў, але толькі сёння можна казаць пра яго папулярнасць і нават зорнасць.

**Этымалагічна назва жанру stand-up паходзіць з англійскай мовы і азначае «прадстаўленне ці расказ маналогу, напоўненага жартамі, кепікамі ці сатырычнымі каментарыямі, чалавекам, які стаіць адзін на сцэне ці перад камерай».**

Комікі, з якімі можна спачатку пазнаёміцца на экране, ужо будуюць уласныя кар'еры, выступаюць з канцэртамі ў краінах СНД (і ў Беларусі таксама часта бываюць). Руслан Белы, Юлія Ахмедава, Слава Камісаранка, Ваня Усовіч, Стас Старавойтаў, Цімур Каргінаў, Нурлан Сабураў абралі для сябе пэўную тэму і стыль для выбудоўвання праграм маналогаў. Так, Юлія Ахмедава «спецыялізуецца» на тэматыцы адносін 30-гадовай адзінокай жанчыны з мужчынамі, Стас Старавойтаў расказвае пра стасункі ў сям'і пасля нараджэння дачкі, а Цімур Каргінаў і Нурлан Сабураў жартуюць пра стаўленне рускіх да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Дарэчы, ёсць сярод комікаў і беларусы (Слава Камісаранка і Ваня Усовіч), якія досыць часта расказваюць пра свае карані і жартуюць пра тое, як будуюць жыццё ў расійскай сталіцы.

Ёсць нашы і сярод удзельнікаў іншага стэндап-шоу для навічкоў «Адкрыты мікрафон», якое з цягам часу аддзялілася ад асноўнага. Так, выдатна тут дэбютаваўшы, Андрэй Калмачэўскі працягвае кар'еру ва Украіне, а Ірына Прыходзька выступае на тэлебачанні і ў фармаце афлайн у беларускай сталіцы.

### Слухаць радыё ці ісці ў клуб

Дзіўна, але першае афіцыйнае стэндап-шоу ў нашай краіне з'явілася найперш на радыё. Адным з яго вядучых стаў вядомы ў вузкіх колах стэндапер, шоўмен Андрэй Макаёнак (ці не па іроніі лёсу — цёзка вядомага беларускага драматурга, аўтара камедый, якія ўжо сталіся сапраўды культавымі для нашага тэатра), а сама праграма «Пасляпятніца» выходзіць па суботах на хвалях радыё Пілот-FM. Расказаць пра тое, як рыхтуюцца яе выпускі, Андрэй пакуль адмаўляецца: надта мала часу прайшло пасля запуску праекта. Але спадзяюся, што ў хуткім часе нашы чытачы даведаюцца пра цікавосткі, пабачаць фота з бэкстэйджу.

Досыць жыццяздольным аказаўся айчынны клубны стэндап. Ледзь не штотыдзень у сталіцы, а часам і ў абласных цэнтрах, ладзяцца тэматычныя вечарынкі ў фармаце «Адкрытага мікрафона». Тут госцем і ўдзельнікам праграмы можа стаць кожны ахвочы. Варта толькі прыдумаць колькі жартаў на актуальныя тэмы ці падрыхтавацца слухаць больш ці менш смешныя выступленні. Сачыць за праграмай шоу можна праз суполку Stand-Up Union у сацыяльнай сетцы «УКантакце».

### Падпісацца на новы youtube-канал

У часы, калі кожны тынэйджар мае свайго любімага відэаблогера, з задавальненнем сочыць за іх актыўнасцю ў сецівe, а самі youtube-зоркі ў рэале здольныя сабраць цэлы гандлёвы цэнтр ці нават вялікую арэну аматараў, не сачыць за жыццём лічбавага свету выглядае маветонам. У гэтым сегменце знойдзецца чым пажывіцца і беларускім аматарам стэндапа. Зусім нядаўна на Youtube з'явіўся канал «Дома паглядзіш», дзе можна пабачыць ролікі з выступленняў айчынных комікаў.

Не так даўно Дзмітрый Нарышкін, творчы кіраўнік праекта і дзейны ўдзельнік Stand-Up Union расказаў у інтэрв'ю, што сярэдні паказчык прагляду ўжо выкладзеных ролікаў — каля 1500. Гэта не так і шмат, але з улікам амаль поўнай адсутнасці рэкламы і прамоцыі лічба не такая і кепская. Аўтары ўжо атрымалі станоўчыя водгукі ад гасцей вечарынак, а таксама прадстаўнікоў галіны з Расіі і Украіны.

Плануецца, што найбліжэйшым часам будуць знятыя 10 іменных выпускаў шоу, а да верасня—кастрычніка канал штотыдзень будзе папаўняцца новымі відэа. Таму поспехаў, «Дома паглядзіш»! Паглядзім?






■ Запрашальнік



## Заўтра ў Мінску з'явіцца Эйфелева вежа

**Яе ўсталююць у Верхнім горадзе адмыслова для канцэрта, што пройдзе ў межах фестывалю «Класіка ля Ратушы з velcom».**

Вечарыну «Tour de Classique», уваход на якую будзе традыцыйна вольным, прысвецяць 25-годдзю ўсталявання французска-беларускіх дыпламатычных адносін, якое мы адзначаем сёлета.

Сама ўстаноўка копіі Эйфелевай вежы стане інтэрактыўным праектам, далучыцца да справы змогуць усе ахвотныя. Натуральна, не забаронена будзе фатаграфавацца, рабіць сэлфі ў непаўторнай і чароўнай атмасферы. Прыемныя сюрпрызы чакаюць і на самім канцэрце. Так, у беларускую сталіцу завітае французскі госць — барытон Аліўе Эт, які выступіць на адной сцэне з найлепшымі айчыннымі майстрамі класічнай музыкі. У выкананні беларуска-французскай каманды прагучаць творы, знакавыя для цэлых эпох. Нагадваем, што працягваецца фотаконкурс для наведвальнікаў музычных вечарын. Каб стаць яго ўдзельнікам і, магчыма, трапіць у лік аўтараў работ для адмысловай выстаўкі, заўтра трэба будзе зрабіць здымак на фоне Эйфелевай вежы і размясціць яго ў сацыяльных сетках з хэштэгам #классикасвелком.

■ Ініцыятыва

# СЕРЫЯЛ ЯК НАГОДА СУСТРЭЦЦА

## Новую серыю «Гульні тронаў» паказалі на вялікім экране ў музеі З. Азгура

**Незвычайную ініцыятыву рэалізавалі кампанія velcom пры падтрымцы «Атлант Тэлекам».**

Не трэба прыводзіць лішніх аргументаў таму, што серыялы даўно і трывала ўвайшлі ў нашу паўсядзённасць. З любімымі героямі кінасаг мы бавім вольныя хвіліны, за іх лёсы перажываем у перапынках паміж сезонамі, самі пераўвасабляемся, прымерваем незвычайныя касцюмы і вобразы для тэматычных вечарынак. Таму і новая ідэя з закрытым, але публічным паказам новай серыі 7-га сезона (а ён абяцае быць заключным у гэтай доўгай гісторыі) на вялікім экране, з разнастайнымі фотазонамі, пачастункамі, сервіраванымі ў сярэднявечным стылі, і безалкагольным順 пуншам ды глінтвейнам у спецыяльна размаляваных кубачках была прынятая на ўра.

Больш за тое, магчымасць трапіць на паказ атрымалі не толькі прадстаўнікі СМІ, шоўмены, але і заўзятыя аматары серыяла. Так, напярэдадні быў праведзены конкурс на найлепшае пераўвасабленне ў героя сагі, білет у залу маглі здабыць і тыя, хто правільна адказаў на ўсе пытанні надзвычай складанага тэста па серыяле, размешчанага на партале tut.by.




Апроч непасрэдна прагляду серыі, удзельнікі вечарынкі маглі сфатаграфавацца на Жалезным троне ў кампаніі мужных рыцараў і бязлітасных белых хадакоў. Зрабіць сэлфі з Маці Драконаў Дайнэрыс Таргарыян ці прадстаўніцай роду Старкаў Арыяй. Для большай пераканальнасці прымерыць скуру лютаваўка і пабываць у кампаніі трохвокага крумкача. Ці не мара для фаната «Гульні...»?

«Гульню тронаў» можна ўспрымаць па-рознаму. Як адлюстраванне фантазійнага свету, прыдуманага амерыканскім пісьменнікам Джорджам Марцінам у кніжным цыкле «Песня Лёду і Полымя» (дарэчы, сцэнарый апошняга сезона ён напісаў раней, чым адпаведную частку сагі, таму заўзятыя чытачы яшчэ змогуць пашукаць адрозненні ў сюжэтах). Як шэраг постмадэрновых лабірынтаў-алюзій на сучасную міжнародную палітыку. Як спробу стварыць эпічнае палатно апавядання ў жанры альтэрнатыўнай гісторыі. Вядома, што сюжэт кожнага з наступных эпізодаў серыяла трымаецца ў строгім сакрэце, а сцэнарысты ды акцёры не маюць права расказваць пра сваё бачанне сімвалаў аповеду. Але не так даўно стала вядома, што новы сезон стане пэўнага кшталту спробай пабудаваць новую версію гісторыі ЗША. Паваротным пунктам, тым самым узмахам крылаў матылька, які прывёў да кардынальных змен, стане Грамадзянская вайна паміж паўночнымі і паўднёвымі штатамі 1861—1865 гадоў. Па версіі пісьменніка і аўтара сцэнарыя, у гэтай вайне перамагла не поўнач (як было насамрэч), а поўдзень.



**Новым сезонам «Гульні тронаў» натхнілася і адна са сталічных піцэрый. Тут у дзень прэм'еры 1-й серыі прайшла тэматычная вечарынка з запрошанымі рыцарамі і героямі сагі. Гасцям прапанавалі з'явіцца ў адзенні, адпаведным каралеўскаму прыёму, а таксама частавалі стравамі з адмысловага меню «Ежа тронаў».**

Думаецца, выдатна, што тэматычныя святы ды вечарынкі, натхнёныя сюжэтамі, героямі папулярных у свеце шоу ўжо перастаюць быць нечым дзіўным і для беларускай сталіцы. Гаворка не толькі пра вузкае кола аматараў, сяброў з агульнымі інтарэсамі, але і пра больш шырокія грамадскія ініцыятывы. І не абавязкова кожная з іх мае на мэце камерцыйны поспех. Важна пабыць разам з аднадумцамі, выйсці з рэжыму камунікацыі анлайн у сацыяльных сетках і зноў вучыцца размаўляць, знаёміцца, бавіць час у рэале. Гэта таксама весела, проста і зусім не старамодна.


Матэрыялы паласы падрыхтавала Марына ВЕСЯЛУХА. vesialuha@zviazda.by

## Субота, 29 ліпеня

### Беларусь 1

**6.15** Існасць.
**6.40 Меладрама «Каханне прыходзіць не адно». (16+).**
**8.20** Кулінарная дыпламатыя. (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Здароўе. (12+).
**10.00** Дача. (12+).
**10.35** Вялікі сэлфі-тур. (12+).
**11.10** 50 рэцэптаў першага. (12+).
**12.10 Серыял «Байкі Міцяя». (12+).**
**13.15, 15.45 Серыял «Мінулае ўмее чакаць». (16+).**
**15.15** Краіна.
**17.30 Меладрама «Недатыка». (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Калі наступіць світанак». (12+).**
**1.10** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў». (6+).
**7.35 Фільм для дзяцей «Саляная прынцэса». (12+).**
**8.40, 22.10** Тэлебарометр.
**8.45** «Свет навыварат». Трэвел-шоу. (16+).
**9.40 Серыял «Шчаслівыя разам-5». (16+).**
**10.45, 20.25** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу. (16+).
**12.20 Меладрама «Вострыя прыправы і страсці». (12+).**
**14.25** Анімацыйны фільм «Рогі і капыты». (12+).
**15.55** Капейка ў капейку. (12+).
**16.35** «Вяселле ўсляпую». Рэаліці-шоу. (16+).
**17.55 Камедыя «Знаёмства з Факерамі-2». (16+).**
**19.40** Рэпарцёр. (16+).
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.15** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці. (16+).
**23.25 Фантастыка «Зорныя войны: Эпізод V. Імперыя наносіць удар у адказ». (12+).**

### Беларусь 3

**7.40** «Сіла веры».
**8.05, 12.35, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.55, 20.30** «Гэты дзень».
**8.25** «Беларуская кухня». Бульбяная бабка. Кіслая капуста з рабрынкамі.
**8.55 «Сабака на сене». Камедыя. (12+).**
**11.05** «Я хачу гэта ўбачыць!» Навагрудак (6+).
**11.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.00** «Навукаманія» (6+).
**12.25** М/ф (0+).
**13.00 «Жандар і іншапланецяне». Камедыя. (12+).**
**14.30** «Майстры і куміры». Народны артыст Беларусі Віктар Вуячыч.
**15.20** «Вандроўнікі ў ночы». Канцэртная праграма з удзелам народнага артыста Беларусі Віктара Вуячыча.
**16.25 «Чатыры танкісты і сабака». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі. (12+).**
**18.15** «Апошні дзень». Алег Даль (12+).
**18.50 «Жэня, Жэнечка і «Кацюша». Трагікамедыя. (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Серыял. (12+).**

### Беларусь 5

**8.00** Хакей. Кубак Мінска — 2017. «Юнацтва» (Мінск) — «Дынама» (Масква).
**9.55, 1.20** Сусветныя гульні — 2017. Вроцлаў. Відзачасопіс.
**10.25, 13.45, 18.25, 21.50, 0.10** Водныя віды спорту. Чэмпіянат свету.
**11.30** Хакей. Кубак Мінска — 2017. Матч за 5-е месца.
**15.25** Хакей. Кубак Мінска — 2017. Матч за 3-е месца. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**17.55** Піт-стоп.
**19.20** Хакей. Кубак Мінска — 2017. Фінал. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.00** Пляжны футбол. Еўраліга. Расія — Беларусь.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**7.05 Серыял «Лонданград» (16+).**
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды» (0+).
**9.20** «Здароўе» (16+).
**10.30** «Смак» (12+).
**11.10** «Ідэальны рамонт» (12+).
**12.10** «Айвазоўскі. На грэбні хвалі» (12+).
**13.20** «Удача ў прыдачу! З «Еўраопт» (12+).
**14.25** «Сам-насам з усімі» (16+).
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20 Маст. фільм «Законны шлюб» (12+).**
**18.00** «МаксімМаксім» (16+).
**19.00** «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+).
**21.05** «Удача ў прыдачу!». Дзённік (12+).
**21.10** «Сёння вечарам» (16+).
**22.40** «КВЗ». Прэм'ер-ліга (16+).
**0.10 Маст. фільм «Трын-трава» (12+).**

### СТБ

**6.15 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**7.55** «Тайны Чапман» (16+).
**8.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**9.30** «Рамонт па-сумленнаму» (16+).
**10.10** «Самая карысная праграма» (16+).
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Залатая ліхаманка». Дак. фільм (16+).
**13.00** «Усім па катку» (16+).
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.45, 1.05 «12 крэслаў». Камедыя (6+).**
**15.15** Канцэрт Міхаіла Задорнава (16+).
**16.40** «Паляўнічыя на скарбы» (16+).
**17.35** «Сляды апосталаў». Серыял (12+).
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Засакрэчаныя спісы. Месяц катастроф: чым пагражае жнівень 2017-га?» (16+).
**21.55 «Пасажыр без багажу». Серыял (16+).**

### МІР

**6.05, 8.20** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**7.50** «Саюзнікі» (12+).
**9.00** «Вой, ма-мач-кі!» (12+).
**9.30** «Любімыя акцёры». Аляксандр Кайданоўскі (12+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабытак рэспублік» (12+).
**10.45 Маст. фільм «Дзесяць негрыцянят» (0+).**
**13.20 Маст. фільм «Вій» (12+).**
**14.55, 2.25** Дак. фільм «Тайны стагоддзя. Ванга. Свет бачны і нябачны» (0+).
**16.15 Серыял «Уваход у лабірынт». (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Сястрычка» (16+).**
**1.00 Маст. фільм «Вертыкаль» (0+).**
**3.15** М/ф (6+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху». (16+).
**7.35 Серыял «Сямейны дэтэктыў». (12+).**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі». (12+).
**12.10** «Пяцёра на аднаго». (12+).
**13.00** «Наша справа». (16+).
**13.15, 14.15 Маст. фільм «Заканы па ўласным жаданні». (12+).**
**15.15, 20.45 Серыял «Пераезд». (12+).**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**22.40 Маст. фільм «Цілі-цілі цеста». (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** «Ты супер!» (6+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Урачэбныя тайны плюс». (12+).
**8.50** «Прыгажосць па-руску». (16+).
**9.45** «НЗ.by».
**10.20** Галоўная дарога. (16+).
**10.55** «Ежа жывая і мёртвая». (12+).
**11.55** Кватэрнае пытанне. (0+).
**13.00** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**13.20** «Удача ў прыдачу!»
**14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+).
**17.10** «Сакрэт на мільён». Аляксей Нілаў. (16+).
**19.25 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**22.50** «Ты не паверыш!» (16+).
**23.30** «Экстрасэнсы супраць дэтэктываў». (16+).

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.05, 21.20, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка». «Том і Джэры. Казкі» (0+).
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах», (0+).
**9.45 «Сінематограф». Маст. фільм «Вядзьмарка» (12+).**
**11.20 Камедыя «Звычайны цуд». (0+).**
**13.40 Глядзім усёй сям'ёй. Фільм-казка «Бураціна» (0+).**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**16.30 Серыял «Эксперт» (16+).**
**17.25 Камедыя «Снеданне ў таты» (12+).**
**19.10 Камедыя «Фокус» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Фэшн із my прафэшн» (0+).
**21.25 Трылер «Наёмныя забойцы» (16+).**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер». (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**8.00** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**9.00, 3.00** М/ф «Тры каты». (0+)
**9.20, 3.20** М/ф «Фіксікі». (0+)
**9.40, 3.40** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**10.00** М/ф «Аліса ведае, што рабіць!» (0+)
**10.30, 2.20** «Ералаш». (6+)
**11.00** Анімацыйны фільм «Пухнатыя супраць зубастых». (12+).
**13.00** Серыял «Як я стаў рускім». (16+).
**15.00** Серыял «Татавы дочкі». (12+).
**17.00** Драма «Арол дзявятага легіёна». (12+).
**19.10** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Баявік «Стралок». (16+).
**23.30** Трылер «Пасланнікі-2: пудзіла». (16+).
**1.20** «Імперыя ілюзій: браты Сафронавы». (16+).
**4.00** «Лаві момант». (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі». (16+).

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Свінарка і пастух». Маст. фільм.
**12.00** «Марына Ладыніна. Кіназорка паміж сярпом і молатам». Дак. фільм.
**12.40** «Аркестр будучыні». Масква.
**13.25, 0.05** «Рака без меж». Дак. фільм.
**14.20** «Чарадзей. Аруцюн Акапян». Дак. фільм.
**14.45** Ілюзіён. «Падарожжа да пачатку часу». Маст. фільм.
**16.15** 200 гадоў з дня нараджэння Івана Айвазоўскага. «Больш, чым каханне».
**16.55** «Хто там...»
**17.25** «Не бойся, я з табой!» Маст. фільм.
**19.55** «Рамантыка раманса». Аляксандру Цфасману прысвячаецца...
**20.50** Да 80-годдзя Віктара Мярэжкі. «Лінія жыцця».
**21.40** «Калі можаш, даруй...» Маст. фільм.
**23.00** «Take 6» у Маскве.
**0.55** «Баксёры». Маст. фільм.
**1.55** «Шукальнікі». «Мільёны Васіля Варгіна».
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** Спектакль «Хто баіцца Вірджыніі Вульф?» 1992 год (18+).
**8.30** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год (12+).
**8.50, 9.40, 15.40, 17.00, 23.45, 2.35, 3.40** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**11.00, 5.00** «Песня-80» (12+).
**11.50** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». 1960 год (12+).
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1960 (16+).
**12.45, 18.50** Маст. фільм «12 крэслаў». (16+).
**17.45** Дак. фільм «Сумленны фатограф» (16+).
**21.30** «Быў час». 2009 год (16+).
**22.30** Маст. фільм «Я цябе ненавіджу» (16+).
**0.00** Фільм-спектакль «Маленькія камедыі вялікага дома». 1974 год (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 6.00, 14.45, 18.30, 21.00, 0.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**5.30** Футбол. «ФІФА».
**8.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**9.15** WATTS.
**9.30, 13.30, 23.45, 2.30** Чэмпіянат свету па водных відах спорту.
**16.30** Веласпорт. «Класіка Сан-Себасцьяна».
**1.15** Конны спорт. Global Champions Tour.

### Кінакамедыя

**0.15** Камедыя «Бінга Бонга». (16+).
**2.05** Камедыя «Прыдуркі». (16+).
**3.35** «Камедыянты (Шоу)». (16+).
**4.05, 14.00** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**4.30** Камедыя «Дублёр». (16+).
**6.00** Камедыя «Па версіі Барні». (16+).
**8.20** Камедыя «Паліцэйская гісторыя». (12+).
**10.10** Камедыя «Паліцэйская гісторыя-2». (12+).
**12.15** Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці». (16+).
**14.15** Камедыя «Уніз па лесвіцы». (16+).
**16.00** Камедыя «Асаблівы хлопец: тупы супергерой». (16+).
**17.30** Камедыя «Укол парасонам». (16+).
**19.15** Камедыя «Дзеці сексу не перашкода». (16+).
**21.10** Камедыя «Самы лепшы тата». (16+).
**23.00** Камедыя «Геніяльны тата». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Усё па фэн-шую» (12+).
**11.00** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**11.50, 2.30** «Хатні гаспадар». Серыял (12+).
**15.15** «Агарова, 6». Дэтэктыў (12+).
**16.50** «Жанна, пажані» (16+).
**17.50** «Вяселле і развод» (16+).
**18.40, 5.30** «10 самых» (16+).
**19.15, 1.40** «Блокбастары» (16+).
**20.15** «Карасі». Камедыя (16+).
**22.10** «Моцны арэшак-3». Баявік (16+).
**0.20** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).

### ТБ1000

**6.10, 15.30** Гонар і прадузятасць (12+).
**8.40** Матрыца (16+).
**11.20** Дурдом на колах (16+).
**13.20** Вялікія вочы (16+).
**18.00** Сэрца дракона (12+).
**20.10** Вясельны перапалох (12+).
**22.15** Матрыца: перазагрузка (16+).
**0.55** Адна сустрэча (16+).
**2.35** Гладыятар (12+).
**5.35** Сем гадоў у Тыбеце (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Мамы (12+).
**8.20** Поп (16+).
**10.50** 24 гадзіны (16+).
**12.35** Труфальдзіна з Бергама. Серыя 1-я (12+).
**14.05** Няўлоўныя: джэкпот (16+).
**15.50** Высоцкі. Дзякуй, што жывы (16+).
**18.25** Нявеста (16+).
**20.20** Мой хлопец — анёл (16+).
**22.20** Джунглі (12+).
**0.05** Параграф 78 (16+).
**2.30** Усе сышлі (16+).
**4.35** Гараскоп на ўдачу (12+).

### National Geographic

**6.00** Папулярная навука. (12+).
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.00** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**10.20** Сапраўдны суперкар. (12+).
**11.50** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам. (12+).
**12.40,15.40** Апакаліпсіс: Першая сусветная вайна. (16+).
**16.30** Апакаліпсіс Другой сусветнай. (16+).
**17.55, 21.00** Пачатак. (12+).
**18.45, 3.10,** Навука будучыні. (12+).
**21.45** Амерыка ў Першай сусветнай вайне 1917—1918. (16+).
**22.30** Секунды да катастрофы. (16+).
**23.20** Даследчык. (18+).
**0.05** Ліхтугі за мяжой. (16+).
**0.55** Служба бяспекі аэрапорта. (16+).
**2.25** Дзіўная Другая сусветная. (16+).

### Discovery

**8.00** Бітвы робатаў. (12+).
**9.00** Сіднейская бухта. (16+).
**10.00** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00, 23.00** Як працуюць машыны. (12+).
**12.00** Голыя і напалоханыя. (16+).
**13.00** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**14.00, 22.00** Гульня на жыццё. (16+).
**15.00** Будаўнікі караблёўгігантаў. (12+).
**16.00** Як мы вынайшлі свет. (12+).
**17.00** Скарб Купера. (12+).
**18.00, 7.10** Вялікі махінатар. (12+).
**19.00, 0.00** Мотарэстаўрацыя. (16+).
**20.00** Вулічныя гонкі. (16+).
**21.00** Смяротны ўлоў. (16+).
**1.00** Акулы з іншага свету. (16+).
**2.00** Дзікая кухня. (16+).
**4.40** Браты Дызель. (16+).

## Zамор'е

### Хто лепш за ўсіх лазіць па какосы

**Чэмпіёнам свету па лажанню на какосавыя пальмы стаў жыхар астравоў Кука Джордж Айона, паведамляе BBC News.**



Айона паказаў найлепшы вынік на чэмпіянаце, які праходзіў на Таіці і ў якім удзельнічалі 16 спартсменаў. Ён ускараскаўся на васьміметровую пальму за 5,62 секунды, апярэдзіўшы на 0,01 секунды Фіапаі Элія з Амерыканскага Самоа, якога аматары гэтага віду спорту лічылі найбольш імаверным пераможцам. Спартсменам, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтвах па лажанні на какосавых пальмах, даецца дзве спробы, каб забрацца на дрэва з максімальнай хуткасцю. Як правіла, яны выкарыстоўваюць вяровачную пятлю, накінутую на ногі, каб лепш адштурхоўвацца ад ствала. Астравы Кука — архіпелаг на поўдні Ціхага акіяна, які ўваходзіць у Каралеўства Новай Зеландыі.

### Не адказаў — сыходжу!

**У тайваньскім горадзе Сіньчжу суд вынес рашэнне на карысць жанчыны, якая запатрабавала разводу з мужам. Ён ігнараваў паведамленні жонкі ў месенджары на смартфоне, піша BBC News.**



Мужчына на працягу шасці месяцаў чытаў дасланае жонкай, але не адказваў ёй. Без якой-небудзь рэакцыі засталася нават інфармацыя пра тое, што яна трапіла ў бальніцу пасля ДТЗ. Адзіны запіс з боку мужа з'явіўся толькі праз некалькі тыдняў пасля аварыі: ён коратка напісаў жонцы пра сабаку і атрыманую пошту. Жанчына таксама паскардзілася на адсутнасць у мужа стабільнага заробку і ня дбаразычлівае стаўленне яго сваякоў. Аднак менавіта нежаданне адказваць на яе паведамленні стала апошняй кропляй, якая вымусіла яе патрабаваць развод. «Паведамленні — гэта вельмі важны доказ. Ён дэманструе агульны стан шлюбу, у якім паміж бакамі адсутнічае камунікацыя», — пагадзілася суддзя, якая разглядала справу. Муж не з'явіўся на судовае пасяджэнне, а таксама не адказаў на высланыя яму паведамленні. Нягледзячы на яго адсутнасць, суддзя ўхваліла развод.

### 27 лінзаў у адным воку

**Урачы выявілі і дасталі з вока брытанскай пенсіянеркі 27 лінзаў, якія яна забылася зняць, паведамляе выданне брытанскай Асацыяцыі оптаметрыстаў Optometry Today.**



Яны былі выяўленыя падчас агляду вока 67-гадовай пацыенткі, якая прыйшла выдаляць катаракту. Урачы звярнулі ўвагу на сінявату заслону на вочным яблыку жанчыны, якая была склеенымі кантактнымі лінзамі. Дэталі выдалялі на працягу двух сеансаў. Жанчына, якая насіла лінзы на працягу 35 гадоў, расказала, што спісвала пастаянны сверб на ўзрост і сухасць у вачах.

**Іван КУПАРВАС.**




# ПЕРАХІТРЫЛА БАБУЛЮ!

...Ірынка, колькі памятае сябе, жыла з бабуляй. Маму яна не ведала наогул (тая адмовілася ад малой, калі ёй не было паўгода), тата жыў недзе далёка ў горадзе: паехаў у заробкі ды так і застаўся. А таму яны гаравалі ўдзвюх.

Бабуля вельмі шкадавала малую, песціла, пякла для яе хрушчы і танюткія блінцы, аддавала апошнюю цукерку ці пернічак... Але ж да працы прывучала таксама. Разам яны прыбіралі ў хаце і на падворку, мылі посуд, палолі градкі, хадзілі ў ягады, грыбы да арэхі. Іншых жа прысмакаў тады не было. Ды і адкуль тыя грошы? Доўгімі зімовымі вечарамі бабуля з унучкай, седзячы на печы, лускалі арэхі і гарбузікі, адна адной расказвалі казкі, чыталі кніжкі. Бабуля вельмі любіла чытаць!

Між тым, час ішоў, малая падрастала.

Ірынцы было гадкоў мо дзесяць ці адзінаццаць, калі ў іх вясковую краму ўпершыню прывезлі... марозіва. Вестка пра гэта ўмомант абляцела ўсе падворкі. Іншыя дзеці, з найбліжэйшых хат, адразу ж пабеглі купляць, есці ды выхваляцца...

Ірынцы таксама хацелася, але ж якія ў бабулі грошы? Нават пытацца сорам!

Вось дзяўчынка і не пыталася: бабуля сама, дастаўшы з кішэні нейкі вузельчык, развязала яго, адлічыла патрэбныя капейкі, сказала:

— На, дзіцятка, збегай і ты, вазьмі сабе порцыю.

Ірынка ў адно імгненне апынулася ў краме, купіла гэтай смакаты і прыбегла дамоў, бо, як заўсёды, хацела падзяліцца з бабуляй, аднак тая замахала рукамі:

— Не, не, даражэнькая! Я не буду... Не хачу... Не люблю! Я яго каштавала — некалі, у горадзе... Так што сама еш...

Асцярожна злізваючы марозіва, Ірынка верыла ёй і... не верыла. Яна думала, як жа абхітрыць бабулю, як пачаставаць, бо яна ж любіць салодкае. І раптам...

— А-ёй, мне халоднае ў зубы зайшло, ратуй, бабулечка! Не магу болей есці! — завойкала яна, аддала сваё марозіва і павалілася на ложак.

Пад шчаку ёй бабуля падала падушку, паглядзела на марозіва.

— Растане ж, — разгубілася яна — лізнула адзін раз, потым другі.

Згледзеўшы гэта, Ірынка, можна сказаць, святкавала: перахітрыла-такі бабулю!..

Шмат гадоў прайшло з таго часу. Дзяўчынка вырасла прыгожай дзяўчынай, стала матуляй, а потым і бабуляй. Але ж дагэтуль і да драбніц яна памятае сваё гаротнае і, у той жа час, шчаслівае дзяцінства.

**Лёля Багдановіч,**
*г. Барысаў.*

# БЕЗВЫНІКОВАЕ ЗНАЁМСТВА

Гэта было недзе ў сярэдзіне 90-х, у Мазыры на Прымаставой плошчы. Менавіта адтуль у розныя бакі раз'язджаліся гарадскія аўтобусы і спыняўся мой, міжгародні «Мазыр — Калінкавічы». Я спакойна чакаў яго, а заадно пазіраў, як гэта робяць іншыя, як туды-сюды шпацыруюць студэнты з нашага інстытута... І раптам сярод іншых чакальнікаў мой позірк выхапіў стройную дзявочую фігурку. Да яе, да гэтай фігуркі, у нязнаёмкі былі доўгія бялявыя валасы, празрыстаблакітныя вочы. А галоўнае, крочыла яна проста на мяне: бліжэй, бліжэй, амаль побач... І ў гэты момант, трэба ж такому здарыцца, моцны парыў ветру падняў яе льняныя локаны, «занёс» да мяне на плячук і нават... пакінуў там, бо заблытаў у засцежцы сумкі, што вісела у мяне на баку.

— Прабачце, — збянтэжана папрасіла бландзінка, спрабуючы выцягнуць локан.

— Мяне завуць Сяргей, — не губляючы часу, прамовіў я.

— А мяне — Наталля, — прыязна ўсміхнулася дзяўчына.

— Ты ў педінстытуце вучышся?

— Так.

— І я...

Наталля гаварыла нешта яшчэ, але я не вельмі слухаў, бо ў галаве маёй пульсавала адна толькі думка: «Вось ён, мой лёс!»

Ну яно ж сапраўды: праз нейкі час мы абодва атрымаем дыпломы, а да таго — можам распісацца, і нас тады, як законных сужэнцаў, разам накіруюць на працу, у адну і тую ж школу. Удваіх з ёй мы будзем хадзіць на працу, удваіх — дамоў... А там, калі Бог дасць, з'явяцца дзеці. Яны будуць сустракаць мяне дома, і жонка абавязкова будзе клапаціцца аб тым, каб мяне смачна пакарміць, каб прыгожа адзець, каб падтрымаць і падбадзёрыць...

Памарыўшы пра гэта, я зноў зазірнуў у вочы Наталлі і, выручаючы яе валасы са сваёй засцежкі, раптам падумаў: «А што, калі ўсё атрымаецца з дакладнасцю наадварот, калі я, ажаніўшыся, буду сам бегаць па крамах, гатаваць ежу, прыбіраць жытло, мыць — прычым не толькі свае адзенне, але яшчэ і жончына... А да ўсяго з яе боку буду адчуваць пастаянны кантроль: маўляў, з работы — ні кроку, ні шток, своечасова, з сябрамі па чарцы — ні ў якім разе, футбол — выкінь з галавы, у водпуск адпаму — крый Божа, нешта сабе купіць — хіба з яе дазволу, на лазню грошай не выпрасіць... Не, вырашыў, гэта не па мне». Ад чаго настрой у мяне стаў рэзка псавацца.

Без ранейшай пяшчоты я вызваліў з засцежкі Наталліны валасы, адвёў вочы ад яе зграбнай фігуркі і як паратунак убачыў... аўтобус — свой, на Калінкавічы!

У час пік, каб уціснуцца ў яго, трэба было пастарацца... Інакш — рызыкуеш застацца «за бортам», будзеш чакаць наступнага.

Людзі, карацей, ламануліся ў вузкія дзверы салона і туды ж панеслі мяне.

— Ты з'язджаеш? — нічога не разумеючы спытала ў мяне бландзінка.

— Так, — кіўнуў я на развітанне, не спытаўшы нават нумар тэлефона.

...Не гатовы, мусіць, быў да стварэння сям'і.

**Сяргей Саковіч,**
*г. Калінкавічы.*

# ПРАПАЛА КАРОЎКА...

Некалі, у хуткім часе пасля вайны, у глыбінцы вельмі не хапала медработнікаў. Але ж гэтай вёсцы пашчасціла: на працу па размеркаванні туды накіравалі маладую доктарку з прыгожым імем Надзея.

На жаль, асобнага жылля для яе ў акрузе не было, таму дзяўчыну ўладкавалі на кватэру. Гаспадыню звалі бабка Лікера (трэба разумець, Лукер'я?) І ўсё ў іх было б па-людску, калі б не характар бабчынага мужа, дзеда Серафіма. Той без дай прычыны мог абляць сваю гаспадыню, прычым — апошнімі словамі.

Але ж гісторыя не пра тое...

З часам, як і варта было чакаць, у Надзеі з'явіліся кавалеры. Выбар іх быў досыць вялікі, але ж сэрца дзяўчыны больш за ўсё хінулася да двух сябрукоў, двух механізатараў Андрэя і Яўгена.

Нехта з іх быў лішні, нехта павінны быў сысці...

«Яўген старэйшы за мяне на два гады. Значыць, ажаніцца ён павінен першы?» — мусіць, так падумаў Андрэй. Але ж на развітанне вырашыў пажартаваць.

Яшчэ задоўга да Каляд ён заўважыў, што каровы ў бабкі Лікеры і бацькоў Яўгена падобныя як дзве кроплі вады. А таму на свята, калі вёска добра заснула, ён падаўся на сябрукову сялібу, зняў з ланцуга карміліцу і павёў да хлява бабулі Лікеры. (Па дарозе перажыў ну вельмі трывожны момант: ля гумна яго ўчулі-такі сабакі! Здавалася, яшчэ хвіліна — і пабудзяць гаспадароў, праваляць усю задуму... Але ж неяк пранесла.)

Пашчасціла і яшчэ раз, калі ішоў назад, ужо з рагуляй бабкі Лікеры.

...Што было на наступную раніцу?

Першай ухапілася бабуля, з даёнкай рушыла ў хлеў, села пад карову і...

Нічога не разумее: вымя пустое, рагуля, месяц таму ацяліўшыся, не дае малака.

Яшчэ больш страх ахапіў кабету, калі ўбачыла, што карову як нібы раздуло (Яўгенава была на цяленні). Значыць, аб'еласяʼ? Трэба выклікаць ветэрынара...

Бабуля кінулася ў хату, падняла гаспадара, але, як і варта было чакаць, атрымала толькі порцыю абразы:

— Ты што, карга, зусім звар'яцела?.. — на ўсю хату распачаў быў ён.

Але ў хлеў-такі рушыў...

Жартаўлівы клубок удалося разблытаць толькі пад абед...

Праз нейкі час Яўген з доктаркай Надзеяй згулялі вяселле. Знайшоў сваё шчасце і жартаўнік Андрэй. Абодва сябры ўжо маюць унукаў, але той выпадак, а таксама бабулю Лікеру і яе бурклівага дзеда ўспамінаюць і сёння.

**Юрый Катовіч,**
*аг. Андроны, Пастаўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# ТУРЫСТЫ-АВАНТУРЫСТЫ

## У тым, што нас дураць турагенцтвы, вінаватыя... мы самі?

ПРЫЯЦЕЛЬКА нядаўна вярнулася з Турцыі. Загарэлая, задаволеная жыццём і самой сабой. У кавярні захопленa дзялілася ўражаннямі: і мора цёплае, і гатэль добры, і персанал прыветлівы. Праўда, з самага пачатку прабелмы былі невялічкія: засялілі не ў той гатэль, які паказвалі на фота, калі купляла пуцёўку. Не, ён зусім не горшы, тыя ж пяць зорак, толькі стаіць далей ад мора — на другой лініі. Яно і лепш, што так атрымалася: на месцы высветлілася, што назад давядзецца ляцець самалётам іншай авіякампаніі, у якой білеты даражэйшыя. Таму добра, што гатэль таннейшы аказаўся: розніца якраз кампенсавала даплату за білеты, а то давялося б яшчэ сто долараў даплачваць...

Дзівячыся наіўнасці неспрактыкаванай падарожніцы, я на ўсякі выпадак усё ж спытала: «А хто вам пра гэта сказаў?» — «Прадстаўнік турагенцтва там, у Турцыі. Ветлівая такая дзяўчына, прыемная...» — «А тыя «залатыя» білеты на самалёт «іншай авіякампаніі» ты ў руках трымала?» — «Канешне, не. Мы ж групай ляцелі, нам толькі пасадачныя талоны ў аэрапорце далі...» Не хацелася псаваць настрой гэтай смуглай прыгажуні, але я ўсё ж паведаміла ёй, што развялі яе па поўнай: узялі грошы за даражэйшы гатэль, засялілі ў таннейшы, розніцу не вярнулі, а прыдумалі байку пра іншы самалёт. «Папала ты, дарагая, як мінімум на сто «баксаў»... На твары на хвіліну знікла бесклапотнасць, яшчэ не сцёртая працоўнымі буднямі, а потым прыяцелька махнула рукой: «Ну і халера з імі, з тымі грашыма! Не буду ж я за іх судзіцца, настрой сабе псаваць...»

ХТО мае хоць мінімальны досвед вандровак праз турагенцтвы, упэўнена, прыгадае нешта падобнае, што здаралася калі не з ім самім, дык у яго на вачах. У мяне асабіста ні адна паездка без такіх вось не вельмі прыемных дробязяў не абышлася. Дагэтуль згадваю «камфартабельны аўтобусны тур у Балгарыю» — не толькі прыгажэнныя краявіды Прыкарпацця і Румыніі, але і румынскія кукурузныя палі, якія даводзілася выкарыстоўваць у якасці прыбіральні. І сорамна, і няёмка, а яшчэ чакаеш, што з-за кукурузы выскачыць яе гаспадар з якой дубінай ці (была такая верагоднасць) з дубальтоўкай... Заставалася толькі наракаць на адсутнасць у Румыніі прыдарожнага сэрвісу...

Праўда, наракалі дарэмна. Усё там ёсць: і стаянкі, і кавярні на іх, і прыбіральні. Але за стаянку аўтобуса трэба плаціць. І плаціць павінна, канешне ж, турфірма. Некаторыя лічаць за лепшае сэканоміць (хаця, падазраю, гэтыя расходы ў кошт пуцёўкі ўключаныя) — кукурузных палёў у Румыніі хапае. Пра ўсё гэта мы даведаліся налета, калі паехалі па тым жа маршруце, толькі з іншай фірмай. З імі падарожжа прайшло гладка — спыняліся на стаянках. Але давялося спрычыніцца да іншага падману. Жанчыну, якая купляла пуцёўку на адну сябе і якой абяцалі аднамесны пакой, на месцы паставілі перад фактам: аднамесных нумароў няма, можам засяліць адну, але ў двухмесны, толькі за яго трэба дапласціць за два тыдні дзвесце долараў. Наша спадарожніца была ў роспачы: у яе з сабой на ўсё пра ўсё тыя дзвесце долараў і былі. Мы з сяброўкай яе тады пашкадавалі: дазволілі паставіць яшчэ адзін ложак у свой двухмесны пакой. Дзяўчына-прадстаўнік фірмы ўздыхнула з палёгкай, але, калі мы паспрабавалі намякнуць: маўляў, шаноўная, мы тут з-за вашых «касякоў» зусім не ў тых умовах будзем адпачываць, у якіх было абяцана, яна тут жа з каменным тварам заявіла: «Вырашаць падобныя пытанні не ў маёй кампетэнцыі»...

ЯШЧЭ ўспамінаюцца прыгоды ў адным з аэрапортаў Туніса. Едучы ў такую далеч, мы, купляючы пуцёўкі, дапытвалі дзяўчыну з турагенцтва: «А хто нас там сустрэне?» — «Не хвалюйцеся, там будзе прадстаўнік нашай фірмы, які вас правядзе да аўтобуса і паедзе з вамі да месца» (З аэрапорта трэба было ехаць у іншы горад.) І вось уявіце: чатыры гадзіны пералёту, тэмпература паветра плюс сорак чатыры па Цэльсію, чужая краіна, чужая мова. А на стойцы пад лагатыпам нашай турфірмы — нікога. Толькі запіска: «Шаноўныя адпачывальнікі! Ваш аўтобус на стаянцы каля аэрапорта, белы мерседэс, нумар такі і такі...» Мы натоўпам з чамаданамі на тую стаянку — а там аўтобусаў — штук дзвесце, усе белыя і палова — мерседэсы! А на дварэ вось-вось сцямнее — там ужо блізка да экватара, таму няма надвячорка, цемра накрывае імгненна... Менавіта тады я ўпершыню папрактыкавалася ў французскай з носьбітамі мовы — да кожнага, на кім была ўніформа аэрапорта, кідалася з благальным клічам «месье!» і, паказваючы напісаны на паперцы нумар аўтобуса, прасіла дапамагчы яго знайсці. Карацей, аўтобус нам шукалі чалавек дзесяць. Загрузіўшыся, нарэшце, у яго, мы паспрабавалі выказаць сваё абурэнне кіроўцу, але ён аказаўся мясцовым і толькі ўпарта паўтараў: «Жо нэ сэ па р'ен» (Я нічога не ведаю). З-за ўсіх гэтых пошукаў мы прыехалі ў гатэль на дзве гадзіны пазней, чым павінны былі, і засяляліся фактычна глыбокай ноччу, пераходзячы з корпуса ў корпус паміж шматлікімі басейнамі, у якія некаторыя нашы спадарожнікі ад стомленасці ды ў цемры пазвальваліся....

УСЕ гэтыя гісторыі, хутчэй тыповыя, чым выключныя, аб'ядноўвае адно. Мне (і, мяркую, большасці маіх тавырышаў па прыгодах) нават у галаву не прыйшло пасля адпачынку кудысьці паскардзіцца на згаданыя «дробязі» ці элементарна ўчыніць скандал у той фірме, дзе куплялі пуцёўкі. (Сярэднестатыстычны еўрапеец, якіх ведаю даволі шмат, абавязкова зрабіў бы або адно, або другое ці спыніўся б на двух варыянтах.) Але гэта не пра нас. Пра нас — «турысты-авантурысты»: мы не будзем псаваць сабе настрой і ўражанні ад выдатнага (бо мора было цёплае) адпачынку з-за нейкіх дробязяў!.. Ці варта тады здзіўляцца, што ў адзін цудоўны момант нам скажуць, што паездкі не будзе, бо гатэль не забраніраваны і білеты на самалёт не праплачаныя, а вярнуць грошы немагчыма па аб'ектыўных прычынах, — як было нядаўна з кліентамі адной мінскай фірмы. Кожны буйны падман пачынаецца з дробязяў: спачатку можна заказаць таннейшы, чым абяцалі кліенту, гатэль, а пасля, калі гэта афёра «выгарыць», — і ўвогуле «забыцца» той гатэль забраніраваць. З дробязяў, на якія мы лічым за лепшае заплюшчыць вочы.

АПОШНІМ часам я падарожнічаю «самаходам» — купіў білет, забраніраваў гатэль праз інтэрнэт — і паехаў. Так, страшнавата, так, пастаянна трэба быць пільным, уважліва чытаць шыльды, табло, паказальнікі, каб не памыліцца і не спазніцца. Не кажу ўжо пра паездкі паміж замежнымі гарадамі на тамтэйшым грамадскім транспарце ці ў самых гарадах... Адным словам, таксама — «турыст-авантурыст». Толькі што па ўласнай волі і згодна з уласным выбарам. Істотная розніца, пагадзіцеся...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** alena@zviazda.by

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18 |

**Предмет аукциона**
**(имущество реализуется одним лотом).**
**Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино**

| Наименование (составные части и принадлежности) | Общая площадь |
|---|---|
| **Цех деревообработки с административными помещениями** (инв. № 615/С-35497)**,** в том числе | 1027,1 кв. м |
| Вент. камеры 2 шт., рампа 2 шт., сети питьевого водопровода (а1) | 184,7 м |
| Сети бытовой канализации (а2) | 255,7 м |
| Сети ливневой канализации (а3) | 287,4 м |
| Очистные сооружения ливневой канализации (а4) | |
| Двухкамерный септик (а5) | |
| Поля фильтрации (а6) | 235 м |
| Покрытия (а7, а8, а9) | 6446 кв. м |
| **Склад** (инв. № 615/С-35853)**,** в том числе пристройка (1) | 150,6 кв. м |
| **КПП** (инв. № 615/С-35856)**,** в том числе ограждение (А1) | 7,6 кв. м<br>639,7 м |
| **ТП** (инв. № 615/С-245) | 68,3 кв. м |
| **Водозаборная скважина** (инв. № 615/С-35855)**,** в том числе насос Grundfos | глубина — 30 м |
| **Насосная станция** (инв. № 615/С-35496)**,** в том числе два резервуара | 25,2 кв. м<br>150 куб. м |
| Сети пожарного водопровода | 484,3 м |

**Иное имущество:**

| **Инв. № по бух. учету** | **Наименование** |
|---|---|
| Входит в №0000801 | Сети электроснабжения (внутриплощадочные) |
| Входит в № 0000980 | Комплект оборудования насосной |
| 0000831 | Котельная установка с комплектом оборудования |
| 0000803 | Силовой трансформатор |
| 0000804 | Силовой трансформатор |
| 0000830, 0000885 | Сушильные камеры с комплектом оборудования (тележка ТД-1250 с рельсами, вентиляторы – 3 шт., эл. шкаф) |
| 0001419 | Агрегат конденсатной сушки |
| 0001481 | Агрегат конденсатной сушки |
| 0000960 | Система противопожарной автоматики |
| 0000848 | Сумматор СЭМ-1 |
| 0000849 | Счетчик эл/эн Евро Альфа ЕА10RL Р2С-4 |
| 0000850 | Счетчик эл/эн Евро Альфа ЕА10RL Р2С-4 |
| 0000805 | Комплект низковольтного оборудования трансформаторной подстанции |

**Сведения о земельном участке**: пл. **2,5727 га** предоставлен продавцу на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно – быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения (обременения) — находится в охран. зонах электрич. сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,2 га

**Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 07 коп.**
(снижена на 50%)

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 28.06.2017**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 07.08.2017 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 04.08.2017 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. **www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by

## Извещение о реализации недвижимого имущества ОАО«Барановичидрев» на вторых повторных торгах 1 августа 2017 года

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А. М. проводит торги в форме аукциона по реализации объектов недвижимости:

Конт. тел.: 8-029-6332490 vel.; (029)8248026МТС; факс (0163)455124;
Emal: mischuk_am@mail

Победитель аукциона оплачивает стоимость Лота №2 в течение 30 дней с момента проведения аукциона.

Цена Лота №2 снижена на 20% от цены, установленной независимым оценщиком.

**ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА**

**Комплекс зданий и сооружений, объединенных в ЛОТ №2:**

**1)** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112496, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, общей площадью 13 623,3 м кв., назначение — здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование — цех оконных блоков.

Свидетельство о государственной регистрации от 02.09.2016 года за номером 110/530-17784, выданное Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**СТОИМОСТЬ: 450,400 рублей, без НДС.**

**2**) Изолированное помещение с инвентарным номером 110/D-2775625, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/1, общей площадью 2129,6 м кв., целевое назначение — административное помещение, наименование — административное помещение.

Свидетельство о государственной регистрации от 29.04.2017 года за номером 110/1756-206, выданное Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**СТОИМОСТЬ: 263,200 рублей, без НДС.**

Капитальные строения по п.п. 1-2 расположены на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003540, зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/1, общей площадью 3,0596 га, в соответствии со свидетельством о регистрации от 26.01.2017 года за номером 110/530-18312, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**3)** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112253, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/4, общей площадью 452,5 м кв., назначение — здание неустановленного назначения, наименование — арочный склад.

**СТОИМОСТЬ: 32,240 рублей, без НДС.**

Свидетельство о государственной о регистрации от 12.07.2016 года за номером 110/530-17637, выданное Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**4**) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112254, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/3, общей площадью 1 130,6 м кв., назначение — здание неустановленного назначения, наименование — здание прирельсовый склад.

**СТОИМОСТЬ: 72,720 рублей, без НДС.**

Свидетельство о государственной регистрации от 12.07.2016 года за номером 110/530-17638, выданное Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

Капитальные строения по п.п. 3-4 расположены на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003525, зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/3, общей площадью 0,7480 га, в соответствии со свидетельством о регистрации от 19.10.2016 года за номером 110/530-17948, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**5)** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-111817, расположенное по адресу, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/2, общей площадью 530,9 м кв., назначение — здание неустановленного назначения, наименование-склад арочный.

**СТОИМОСТЬ: 37,840 рублей, без НДС.**

Свидетельство о государственной регистрации от 23.03.2016 года за номером 110/1243-2640, выданное Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003524, зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/2, общей площадью 0,4697 га, в соответствии со свидетельством о регистрации от 19.10.2016 года за номером 110/530-17947, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**ОБЩАЯ СТОИМОСТЬ ЛОТА №2 — 856,400 рублей, без НДС.**

Составные части к ЛОТУ №2:
- часть забора — 1040,4 м/п;
- асфальтовое покрытие — 2,234 кв. м;
- помещение сторожа;
- станция пожаротушения;
- ворота.

Оплачиваются победителем торгов (участником) по отдельному договору купли-продажи.

Сумма задатка: 10% от начальной цены Лота №2 в рублях РБ

Назначение платежа — задаток за участие в аукционе. Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с-BY68BPSB30121226161389330000; BIC-BPSBBY2X в ОАО «БПС-СберБанк», код 369, г. Минск.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению. Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по ЛОТУ №2 в срок до 14.00 26.07.2017 года организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу: 225410, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

